Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 СНЕЖНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 237 (30117)

ШКОЛА ЛІДАРСТВА ДЛЯ БУДУЧАГА ПЕДАГОГА

ЧЫРВОНКА

З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА ЛЮБОЎ ДА ОПЕРЫ

ЧЫРВОНКА

ЛІЧБА ДНЯ

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

1394

выбарчыя камісіі, у ліку якіх 6 абласных і Мінская гарадская, 110 акруговых, 118 раённых, 10 гарадскіх — у гарадах абласнога падпарадкавання, 14 гарадскіх — у гарадах раённага падпарадкавання, 8 пасялковых і 1127 сельскіх сфарміравана ў краіне для правядзення выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання. У камісіі вылучана 9614 прадстаўнікоў. Больш за ўсё вылучылі сваіх прадстаўнікоў палітычныя партыі і іншыя грамадскія аб'яднанні — 4909 чалавек. Ад грамадзян шляхам падачы заяў — 4041, ад працоўных калектываў — 664.

КАРОТКА

- Мінчан запрашаюць разам запаліць навагодня агні на галоўнай ёлцы краіны 10 снежня на Кастрычніцкай плошчы а 16.45. Запальванне галоўнай ёлкі краіны дасць старт рабоце ўсёй светлавой ілюмінацыі ў Мінску.
- **Памерла народная артыстка Беларусі Людміла Бржазоўская.**

- Батанічны сад 8 снежня адчыняе дзверы ў закрыты калекцыйны фонд.
- Больш за 140 выпадкаў адзёру зарэгістравана за год у Беларусі, большасць захварэлых не прышчэплены.
- **Брэсцкую вобласць за 11 месяцаў наведалі 1,6 млн турыстаў.**
- Масавы збор шышак пачаўся ў лясгасах Віцебскай вобласці.

Справа друку

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Уладзімір СВІРЫД вучыцца ў Мінскім дзяржаўным каледжы паліграфіі на спецыяльнасці «Друкар». Навучэнцы асвойваюць прафесію на сапраўдных друкарскіх машынах — напрыклад, гэта, на якую хлопец устанаўлівае друкарскую форму, — шматфарбавая афсетная. На падобнай нярэдка друкуюць і «Звязду», магчыма, зусім хутка і Уладзімір, стаўшы кваліфікаваным спецыялістам, спрычыніцца да выпуску нашай газеты.

Правілы бяспекі

БЕЗ ТРАЎМАЎ І АБМАРАЖЭННЯЎ

З горкі — толькі кіраваны палёт

Гэты халодны сезон дзятва адкрыла з першых дзён снежня. Ужо цяпер ён радуе па-сапраўднаму зімовым надвор'ем — з лёгкім марозам і багатым снегам. Гэта сапраўднае свята для ўсіх, хто любіць актыўны зімовы адпачынак. Аднак бестурботнае стаўленне да мер бяспекі пры катанні на каньках і лыжах, санках і цюбінгах кожны год нярэдка прыводзіць да сур'ёзных траўмаў. І кожны год спецыялісты паўтараюць ісціны, пра якія мы чамусьці забываем. Што ж, нагадаем яшчэ раз.

КАБ ХОЛАД НЕ СТАЎ НЕЧАКАНАСЦЮ

Паводле інфармацыі **ўрача-траўматолага, намесніка загадчыка па вучэбна-метадычнай рабоце кафедры траўматалогіі і артапедыі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Івана ДАЎГАЛЕВІЧА**, галалёд з'яўляецца прычынай мноства траўмаў, атрыманых у зімовы перыяд, у тым ліку дзецьмі.

СТАР. 3

Фота Андрэя ФЕАКІСТАВА.

Нашы людзі

Майстар хлебнага мастацтва

Фармоўшчык цеста хлебабулачнага ўчастка філіяла Аршанскі хлебазавод ААТ «Віцебскхлебпрам» Марына МАРОЗАВА заваявала залаты медаль на Міжнародным чэмпіянаце кандытарскага мастацтва — 2023, які праходзіў у рамках 8-га Міжнароднага хлебнага салона ў Мінску.

Але сёлетняя перамога жанчыны — не адзіная за гады на хлебазаводзе. Майстар з Оршы пакарыла не толькі беларускае, але і замежнае журы сваім уменнем пераўтвараць муку і ваду ў мастацкія творы. У 2018 годзе Марына Марозава ўдзельнічала ў міжнародным чэмпіянаце кандытарскага мастацтва, які праходзіў у рамках выставы Expo sweet-2018 у Варшаве. У конкурсе за мяжой фармоўшчык удзельнічала ўпершыню, яе работа з цеста «Згублены свет» была адзначана сярэбраным медалём.

У 2020 годзе Марына Марозава ўдзельнічала ва Усесусветнай кулінарнай алімпіядзе ў нямецкім горадзе Штутгарце, такое кулінарнае спаборніцтва праходзіць раз у чатыры гады, тады ў ім удзельнічала каля дзвюх тысяч кандытараў з усяго свету. Работа жанчыны з салённага цеста «У пошуках прыгод» была адзначана «бронзай».

У 2021 годзе Аршанскі хлебазавод вярнуўся з 27-й Міжнароднай спецыялізаванай аптовай выставы-кірмашу «Прадэкспа-2021» з узнагародамі. На чэмпіянаце кандытарскага мастацтва жанчына прадставіла работу з цеста «Марскі воўк», за што атрымала залаты медаль. У скарбонцы вопытнага фармоўшчыка ёсць і грамата Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

Дзяржаўны інтарэс

«Без спрыяльнага навакольнага асяроддзя і экалагічнай бяспекі развіццё немагчыма»

У Брэсце пад старшынствам Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылося выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі

Фота БелТА.

Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі сумесную работу, якая праводзіцца прыродаахоўнымі арганізацыямі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама іншымі дзяржаўнымі органамі па эфектыўным выкарыстанні і ахове прыродных рэсурсаў. Аднак найперш запрошаныя, сярод якіх — кіраўнікі рэспубліканскіх ведамстваў, дэпутаты і сенатары, наведалі вытворчыя аб'екты беларуска-германскага сумеснага прадпрыемства «Санта Брэмар».

«ТРЭБА РЭГУЛЯВАЦЬ ТАРЫФЫ»

Прадпрыемства з'яўляецца адным з найбуйнейшых вытворцаў прадуктаў харчавання не толькі ў краіне, але і Еўропе. Удзельнікі пасяджэння пабывалі ў лагістычным экакомплексе, прызначаным для захоўвання гатовай прадукцыі, і азнаёміліся з работай халадзільнага комплексу на прыродных холадагентах, уведзенага ў строй у мінулым годзе. Установка магутнасцю 16 МВт забяспечвае прамысловым холадам цэхі сумеснага прадпрыемства, не разбураючы пры гэтым азонавы слой і дазваляючы знізіць выкід вуглякіслага газу на 4,2 тоны за год.

Як звярнула ўвагу падчас наведвання вытворчасці **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**, для таго, каб прадпрыемства не несла выдаткі (на ўтрыманне, энергетыку), трэба рэгуляваць тарыфы. Па яе словах, тарыф павінен быць іншы ў параўнанні з тымі кампаніямі, якія праклалі калектар і скідаюць адходы без ачысткі. «Гэта абсалютна прававерна, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Калі мы хочам, каб нашы прадпрыемствы будавалі ачышчальныя збудаванні як трэба, вядома, іх трэба да гэтага матываваць».

За сістэму заахвочвання вытворцаў выступіў і кіраўнік кампаніі «Санта Брэмар» Аляксандр Машэнскі. Ён паведаміў, што ў найбліжэйшыя пяць гадоў сумеснае прадпрыемства плануе ўкласці ў розныя экалагічныя праекты 45 мільёнаў долараў.

«ГАЛОЎНАЕ, КАБ АД ВАС ЗЫХОДЗІЛА ІНІЦЫЯТЫВА»

Выступаючы на пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, Наталля Качанава адзначыла, што ў сілу комплекснага міжведамаснага характару пытанняў, якія разглядаюцца, намаганняў толькі профільных міністэрстваў, зацікаўленых у экалагічна паспяховай Беларусі, відавочна недастаткова. «Ключавую ролю неабходна адводзіць мясцовым органам улады, якія непасрэдна ўзаемадзейнічаюць з насельніцтвам і працуюць тут, на зямлі, добра ведаюць спецыфіку свайго рэгіёна і рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі на месцах», — канкрэтызавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу, што на парадак дня пасяджэнняў Савета традыцыйна выносяцца найбольш актуальныя пытанні, якія маюць грамадскі рэзананс, здольныя ўплываць на паступальнае развіццё краіны. «Важнасць разгляду розных аспектаў сумеснай дзейнасці прыродаахоўных арганізацый, органаў кіравання і самакіравання не выклікае сумненняў, — канстатавала яна. — Гэта адпавядае патрабаванням кіраўніка дзяржавы і рашэнням Усебеларускага народнага сходу. Без спрыяльнага навакольнага асяроддзя і экалагічнай бяспекі развіццё ў прынцыпе немагчыма».

Па словах Наталлі Качанавай, ахова навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў — адзін з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Савета Рэспублікі. Толькі за перыяд з 2020-га да 2023 года скарэкціраваны Кодэкс аб нетрах, Лясны кодэкс, законы «Аб ахове навакольнага асяроддзя», «Аб ахове атмасфернага паветра», «Аб гідраметэаралагічнай дзейнасці», «Аб абыходжанні з адходамі», «Аб каранціне і абароне раслін», законы па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання, забеспячэння адзінства вымярэнняў і аховы водных рэсурсаў, дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Пры гэтым большасць з пералічаных законаў былі прадметам абмеркавання на дзеючым пры Савеце Рэспублікі экспертным савеце з запрашэннем зацікаўленых і тых спецыялістаў, якія займаюцца гэтай праблематыкай.

Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што ёсць пытанні, якія ўжо сёння ляжаць на паверхні і якія трэба ўрэгуляваць. «Галоўнае, каб ад вас зыходзіла ініцыятыва, — звярнулася спікер да ўдзельнікаў пасяджэння. — Каб мы не зацягвалі і не адкладалі іх вырашэнне, а разглядалі ўжо сёння. У тым ліку там, дзе трэба рэгуляваць гэта законам. Мы гатовы да гэтай работы і будзем рабіць аператыўна, калі гэта неабходна. Мясцовыя органы ўлады павінны падказваць нашым навукоўцам, якія нішы яшчэ не занятыя, якія рашэнні і тэхналогіі найбольш запатрабаваныя, не супрацьпастаўляючы пры гэтым ахову навакольнага асяроддзя і атрыманне прыбытку ад эканомікі. Са свайго боку мы гатовы аказаць садзейнічанне ва ўрэгуляванні работы з рэспубліканскімі органамі ўлады, быць сувязным звяном, уносіць свае прапановы і ініцыятывы».

Паводле БелТА.

Па сутнасці

СМЕЛАСЦЬ І ПРАЎДА

Памяць старанна захавала аповед, пачуты ад колішняга дэкана журфака. Доктар гістарычных навук з болем у сэрцы расказваў аб паркеце ў Букінгемскім палацы. Тая шыкоўная падлога — з белавежскіх дубоў. Іх ссякалі і прадавалі для замежных палацаў захопнікі і акупанты. І зараз ужо не надта важна, рабілі гэта кайзераўскія войскі, польскія асаднікі, альбо прадпрымальныя бенефіцыяры нацысцкага СС. Важна, што нішчылі нашых людзей і нашу прыроду.

У адным з «аплотаў заходняй цывілізацыі» пад нагамі істэблішмента — сімвал беларускай моцы і хараства. Як гэта сімвалічна. Лонданскі лорд, брусэльскі чыноўнік, амерыканскі палітык — усе яны нейкі час пад абцасамі трымалі свет і зараз намагаюцца рабіць тое ж самае. Але цяпер паслухмянасць выхоўваюць іншымі варыяцыямі. У тым ліку рознымі «дэмакратычнымі» метадамі, хаваючы свае сквапныя мэты клопатамі аб планеце.

«Зялёны» парадак дня апанаваў і моладзь. Модна быць экалагічным. Але ж пачакайце. Чаму адны людзі — некалькі мільярдаў — павінны змяніць звычкі, уцяцца (нібы ў Піліпаўку сустрэлі на сваім шляху ваўка), а некалькі дзясяткаў краін будуць і надалей шыкаваць? І весці войны супраць чалавецтва, вынішчаючы прыроду. Якое і хто ім даў права? Пад лязо палітычнага валюнтарызму трапіла і наша Белавежская пушча — самая чыстая частка Еўропы, некранутая сусветная спадчына. Колькі ўжо жывёл загінула, сутыкнуўшыся з бар'ерам заходняй цывілізацыі, колькі рэлікцтавага лесу загубілі, каб узвесці яго.

Зверскія паводзіны польскіх уладаў так і засталіся незаўважанымі. Вось вам і «зялёны» парадак дня, і «праўда» заходняга свету. Праўду ўсяго чалавецтва агучыў наш Прэзідэнт. За некалькі хвілін перадаў пачуцці і Глабальнага Поўдня, і сапраўднай суверэннай Еўропы. Была Фултанская прамова Чэрчыля, якая развязала «халодную вайну», смела прагучала Мюнхенская прамова Пуціна, якая адкрыла праўду усветнага гегеманізму. А Дубайская прамова Лукашэнкі проста скінула заслону заходняй бязгрэшнасці. Ухвальна ківалі журналісты, уважліва слухалі кіраўнікі іншых дзяржаў. Гучна, смела і сумленна сказана. Гэта яшчэ такі заклік і выклік — адмаўчацца не выпадзе. Час выходзіць з умоўнай зоны камфорту ў міжнародных адносінах. Інакш «разбудзяць» альбо бомбы «галоўных дэмакратый свету», альбо цунамі. Прырода не церпіць крывадушнасці.

І на вяршынях сусветнага палітычнага алімпу — праўда ў павазе. Трэба было бачыць чаргу з журналістаў і шэраг кіраўнікоў свету, з якімі правёў перагаворы наш Прэзідэнт. Саміт паказаў, каго большасць і за кім будучыня. Скептыкі запярэчаць: маўляў, Еўропа — гэта цэнтр сусвету. Дарэчы, цэнтр Еўропы — пад Полацкам. А што датычыцца такой палітычнай з'явы, як Еўропа — тут таксама клімат змяняецца. І ў гісторыі такое ўжо было. Неаднаразова. Пыхлівыя імперыі знікалі... Надышоў час іншых краін — больш сціплых, але сапраўды незалежных. Гэта таксама прадэманстраваў саміт.

Вашынгтон цісне на Брусэль, а Брусэль — на сталіцы Еўропы. Але на Белград і Будапешт не надта атрымліваецца. З сербскім калегам Вучычам Аляксандр Лукашэнка і паразмаўляў на палях саміту, і сядзеў у адным радзе. Ззаду і наводдаль коса пазіраў кіраўнік Польшчы. Атрымалася нават сімвалічна. З'явіліся каментарыі: Дуда глядзеў ці то з крыўдай, ці то з зайздрасцю. Карціна маслам — «Адзінота еўрапейскага штата ЗША». Дарэчы, Варшава шмат зрабіла, каб ізаляваць Беларусь. Дарэмна. Дуда здолеў пераканацца на свае вочы. Час уніё прайшоў. Надышоў час саюзаў самадастатковых краін. Варшава можа далучацца, далонь Мінска не сціснута ў кулак, нават адкрыта для поціску рукі. Мы не злапамятныя. Але зараз мы асцярожныя. Дарэчы, увесь свет цяпер пазнаў сэнс беларускага выразу «па завуголлі». Кіраўнік Беларусі гэты тэрмін прывёў, калі распавядаў пра пошук грошай на абарону прыроды. Цяпер «па завуголлі» яшчэ можа стаць і такім неафіцыйным палітычным тэрмінам. Мінае перыяд, калі большасць краін былі «ў завуголлі» міжнароднага жыцця планеты.

Дарэчы, што ў геапалітычным клімаце, што ў звычайным. Беларусь не дастаўляе турботы. Наш уклад у сусветныя выкіды парніковых газаў мізэрны — 0,2 працэнта з 200 краін свету. А вось карысць ад нас адчувальная і для кантынента, і для ўсёй планеты. Адназляем біяразнастайнасць лясоў ледзь не з часоў Сярэднявечча. У Беларусі амаль дзесяць працэнтаў тэрыторыі — гэта асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі... Даўней, змагаючыся з наступствамі засухі, нашы продкі часам выкарыстоўвалі самыя народныя метады кшталту баранавання... ракі. На аўтэнтычны абрад можна было глядзець гадзінамі. Цнатлівыя прыгажуні з усёй акругі збіраліся да ракі і цягнулі барану па высахлым рэчышчы. Дзейсна спрабавалі вярнуць прыродны баланс, а не чакалі, што неба злітасцівіцца. Вось зараз і сучасная Беларусь нібыта робіць тое ж самае. Еўропа дыхае менавіта нашымі беларускімі «лёгкімі» — Палескімі балотамі, якія разам з унікальнай экасістэмай захоўваем і ахоўваем.

На геапалітычны клімат уздзейнічае заакіянская «ружа ветроў». І клімат прыродны таксама псуе гэтая заходняя хеўра. Ды і «зялёны» парадак дня спрабуе выкарыстаць для чарговага ціску на астатні свет. Маўляў, вы тут нічога не стварайце і пажадана не нараджайце. Ператварыцеся ў перыферыю свету, рынак таннай сыравіны, дармовых рабоў і рынак збыту. А мы — «барэлеўскі сад» — і без вас забрудзім планету. Палічым патрэбным — і палосы памяняем, і арыенціры — ад гендарных да палітычных... Лукашэнка дакладна спакойна за гэтым назіраць і падпарадкоўвацца не будзе. «Хопіць!» — аб гэтым таксама выразна сказаў беларускі лідар. Геапалітычны клімат павінна фарміраваць усё чалавецтва. Мо тады і прыродны клімат стане меней падкідваць неспадзяванак і катаклізмаў.

Смеласць і праўда — гэтага так не хапае сучасным людзям. А яшчэ павагі да сваёй зямлі. Усё імкнёмся да іншаземных берагоў. Перад тым, як купіць білет удалячынь, спазнай Беларусь. Таямніцы Свіцязі, харастно Прыпяці, кручы бацькі-Нёмана, хвалі Дняпра. Ды ўвогуле здзейсніце падарожжа да хаты дзядоў. Не забывайцеся на родныя сцежкі. Тады і зямля, і нябёсы не забудуць нас. Ці то супадзенне, ці то заканамернасць, але пасля праўдзівай прамовы Лукашэнкі на кліматычным саміце ў Беларусі пачалася сапраўдная, як мае быць, зіма.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Блізкая ўлада

БУДАЎНІЧЫЯ НЕДАРОБКІ, ЗЯМЛЯ, ДАРОГІ...

Праблемы, якія сталі прычынай звароту жыхароў Магілёўскай вобласці ў аблвыканкам

На прыём да старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ запісаліся жыхары Магілёўскага раёна, Шклова і Клімавіч.

Шматдзетнаму бацьку спатрэбілася дапамога ў вырашэнні зямельнага пытання. Сутнасць справы такая: у заяўніка ва ўласнасці шэсць сотак зямлі, але год таму ён звярнуўся ў Магілёўскі райвыканкам з просьбай выдзеліць яму дадатковы ўчастак, які б прымыкаў да таго, што ўжо ёсць. Мяркуючы па інфармацыі аб незанятых зямельных участках, якая размяшчалася на сайце Магілёўскага райвыканкама, падыходзячы варыянт быў. Па заяве мужчыны райвыканкам накіраваў пакет дакументаў у Магілёўскае агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры для афармлення права валодання адным з такіх участкаў. Паслуга абышлася кліенту ў 354 рублі. Але праз некалькі месяцаў высветлілася, што зямля, якая падавалася як не занятая, мае гаспадароў. У выніку заяўніку адмовілі. Ён звяртаўся ў землеўпарадкавальныя службы райвыканкама і аблвыканкама, каб дапамаглі разабрацца, але чуў адзін і той жа адказ: зямля ўжо ў карыстанні. Каб вырашыць пытанне, шматдзетны бацька прыйшоў па дапамогу да губернатара. Ён аргументаваў, што сям'я ў яго вялікая, і тых шасці сотак, якія ёсць, не хапае. Да таго ж праблема ўзнікла не па яго віне.

Анатоль Ісачанка паабяцаў, што пытанне будзе вывучана ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, а па выніках яго разгляду дадзены пісьмовы адказ.

Яшчэ адна зямельная праблема стала прычынай звароту на прыём да губернатара сям'і з Магілёўскага раёна. У 2018-м годзе яны набылі ў вёсцы Гарадшчына дзесяць сотак зямлі, а сёлета звярнуліся ў Буйніцкі сельсавет і Магілёўскі райвыканкам, каб купіць яшчэ адзін — плошчай дзевяць сотак. Іх абнадзеі, і яны вырашылі, што здзелка адбылася. Аплацілі кадастравы кошт зямлі ў памеры 6 тысяч рублёў і добраўпарадкавалі яшчэ не аформлены на іх участак — завезлі 70 машын грунту, паставілі агароджу, засеялі газон, пасадзілі пладовыя дрэвы. А калі звярнуліся ў сельсавет узаконіць зямлю, даведаліся, што ім адмовілі ў яе выдзяленні.

Губернатар даў распараджэнне разабрацца з пытаннем у адпаведнасці з заканадаўствам і дапамагчы сям'і.

Пешаходныя дарожкі па вуліцы Луначарскага ў Шклове восенню і вясной залівае вадой і па іх немагчыма хадзіць — гэта і стала нагодай для звароту жыхароў у аблвыканкам. Шклаўчане паведамілі, што даўно спрабуюць вырашыць пытанне, але безвынікова. Сёлета раённыя ўлады паабяцалі зрабіць рамонт да верасня і прыступілі да яго ў лістападзе. Дарожкі разабралі, але маразы спынілі будаўнічыя работы. Жыхары абураюцца, бо цяпер без тратуараў яны засталіся і ў зіму. Анатоль Ісачанка паабяцаў, што вясной работы будуць праведзены належным чынам. Пытанне пастаўлена на кантроль.

А вось з праблемай будаўнічых недаробак, на якія паскардзілася шматдзетная маці з Клімавіч, старшыня аблвыканкама патрабаваў разабрацца да новага года. Летась заяўніца атрымала кватэру ў новым пяціпавярховіку, і з тых часоў яна ходзіць па розных інстанцыях і шэрагам прэтэнзій. Яе не задавальняе якасць уваходнай дзверы, газавай пліты, укладкі ламіната. Ёсць акты абследаванняў, якія пацвярджаюць наяўнасць недахопаў. Акрамя гэтага, жанчына скардзіцца на тое, што ў доме не працуе ліфт, хоць аплата за карыстанне ім спаганяецца, і на неабгрунтаванасць налічэння аплаты за ацяпленне. Анатоль Ісачанка патрабаваў на гэтым жа тыдні камісійна абследаваць кватэру і зафіксаваць усе недахопы, якія трэба ліквідаваць да канца снежня.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

БЕЗ ТРАЎМАЎ І АБМАРАЖЭННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Зіма толькі пачалася, але, па апошніх даных, у адну толькі шостую Мінскую бальніцу ў сярэднім за суткі паступае ад пяці да васьмі чалавек з «халоднымі» траўмамі. Палова з іх — дзеці», — адзначыў ён.

Спецыяліст заўважыў, што кожную зіму дзіцячы траўматызм павялічваецца прыкладна на траціну. Санкі, лыжы, канькі — самыя любімыя забавы дзяцей зімой. На жаль, менавіта яны становяцца прычынай многіх траўмаў. Тут узрастае роля дарослых, якія павінны навучыць дзіця правілам паводзін, што дапамогуць пазбегнуць атрымання траўмаў.

У першую чаргу, дарослыя павінны пераканацца, што санкі не пашкоджаны — з усімі дошчачкамі, мацаванне на лыжах надзейна і правільна прымацавана да ног дзіцяці, а канькі патрэбнага памеру.

Менавіта дарослыя павінны пракантраляваць тыя месцы, дзе гуляюць іх дзеці зімой. Схіл, які выбіраецца для спуску на санках ці лыжах, абавязкова павінен быць удалечыні ад дарогі: зімой дарога слізкая, і не заўсёды кіроўца транспартнага сродку зможа спыніць яго ў патрэбны момант, калі хтосьці таксама на хуткасці вылеціць на праезную частку з гары.

Кожнае дзіця павінна разумець, што, катаючыся з заплюшчанымі вачыма, можна сутыкнуцца з суседам або дрэвам, а спуск спіной наперад увогуле небяспечны.

На каньках лепш за ўсё катацца ў спецыяльна абсталяваных месцах або на пляцоўках. Калі ж дзеці гуляюць на замерзлых мясцовых рэках, азёрах і сажалках, то яны павінны ведаць, што:

Нельга *катацца па першым лёдзе. У месцах замярзання галінак, дошак і іншых прадметаў лёд бывае яшчэ слабейшы, асабліва калі такія месцы запарушаны снегам.*

Нельга *катацца, нават калі лёд ужо трывалы, бліжа да палонак і прамыін. Небяспечна выбягаць і скакаць з берага на лёд, калі невядомая яго трываласць. Не варта выпрабоўваць трываласць лёду ўдарамі нагой, так можна і правалiцца.*

Гульня ў снежкі — яшчэ адна даволі небяспечная зімовая забава. Трэба берагчы ад такіх «снарадаў» твар. Задача дарослых — пераканаць дзіця не кідаць снежкі ва ўпор і не цэліць у галаву. Трэба тлумачыць дзіцяці, што нельга кідацца снежкамі з ледзяной скарыначкай і абледзянелымі кавалачкамі снегу. Зацвярдзелыя «боепрыпасы» могуць ударыць не слабей за камень.

ТОЛЬКІ ЯКАСНАЯ ЭКІПІРОЎКА

Пры выхадзе на зімовую вуліцу, па словах Івана Даўгалевіча, па-першае, трэба правільна падбіраць абутак. У гэтым выпадку перавагу лепш аддаць абутку з рабрыстай падэшвай, выкананай з мяккай гумы або тэрмаэластапластаў. Дзяўчатам трэба памятаць, што нашэнне ў галалёд абутку на абцасах павялічвае ў некалькі разоў рызыку атрымаць траўму.

Навучыце дзіця асноўным правілам паводзін на вуліцы ў галалёд. Падчас перамяшчэння па слізкай вуліцы трэба не спяшацца, пазбягаць рэзкіх рухаў, пастаянна глядзець сабе пад ногі. Калі трэба азірнуцца, не варта гэта рабіць на хаду — лепш спыніцца. Ногі пры хадзьбе павінны быць злёгку расслабленыя і сагнутыя ў каленях, корпус пры гэтым крыху нахілены наперад. У галалёд небяспечна трымаць рукі ў кішэнях, таму што пры падзенні вы не паспееце іх выняць і ўхапіцца за што-небудзь.

Немалую небяспеку ў галалёд уяўляюць прыступкі, але, калі вам усё ж такі давядзецца спускацца па слізкай лесвіцы, то нагу неабходна ставіць уздоўж прыступкі, у выпадку страты раўнавагі такая пазіцыя дазваляе з'ехаць уніз настолькі акуратна, наколькі гэта магчыма ў падобнай сітуацыі.

Яшчэ адна распаўсюджаная зімовая траўма — абмаражэнне. Пашкоджанне тканак пад уздзеяннем холаду можа наступіць не толькі пры нізкіх тэмпературах паветра, але і пры тэмпературы вышэй за нуль, асабліва ў перыяды снегападу, пры вільготным надвор'і, мокрай вопратцы і парушэнні нармальнага кровазвароту (калі цесны абутак). Абмарозіць лягчэй за ўсё пальцы ног і рук, шчокі, нос і вушы.

У гульні часткі цела замярзаюць незаўважна, без болю, таму неабходна часцей звяртаць увагу на колер чырвані ў дзіцяці, правяраць адчувальнасць скуры твару, пастаянна варушыць пальцамі рук і ног. Нармальны румянец — далікатна-ружовага колеру. Калі на прагулцы вы заўважылі, што румянец ў дзіцяці нераўнамерны, з ярка-чырвонымі або белымі плямамі — тэрмінова вяртайцеся дадому: гэта прыкметы абмаражэння.

Правільна апранайце дзіцяці для прагулак: неабходныя рукавіцы-непрамакашкі, шалік, шапка, якая не прамокне, на цёплай падкладцы і абутак, які не прапускае ваду. Скуру твару можна абараніць спецыяльным дзіцячым крэмам, які не змяшчае вады.

Але зімой да спісу траўмаў дадаецца яшчэ і рызыка «прыклеіцца». Напрыклад, дзіця набегалася, разгарачылася, зняло рукавічкі і дакранулася да жалезнай канструкцыі. Усё, прылілпла. Яшчэ горш, калі малы вырашыў паэксперыментаваць і лізнуў жалеза, да прыкладу, спінку санак.

Калі ваша дзіця займаецца якімі-небудзь зімовымі відамі спорту, паклапаціцеся не толькі аб яго спартыўнай вопратцы, але і аб ахове. Накаленнікі, налакотнікі, ахову для пазваночніка лёгка знайсці ў крамах.

ДАРОГА МОЖА БЫЦЬ СЛІЗКАЙ

Узімку ўзрастае колькасць транспартных траўмаў. Часта дзіця бачыць, што машына набліжаецца, але спадзяецца праскочыць. Машына ж проста не паспявае затармазіць, паколькі на слізкай дарозе тармазны шлях у аўтамабіляў значна большы.

Перасякаючы праезную частку дарогі, варта быць вельмі ўважлівым, і, вядома ж, карыстацца правілам пераходу на іншы бок вуліцы выключна па пешаходным пераходзе, ні ў якім разе не грэбаваць ім.

Нельга адпускаць маленькіх дзяцей адных пераходзіць праз дарогу. А школьнікам трэба растлумачыць асаблівасці зімовых правілаў бяспекі.

ЦЮБІНГ — КАВАРНЫ СНАРАД

Па словах **урача-нейрахірурга Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай нейрахірургіі Максіма МЯЛЕШКІ**, зімой медыкі гэтай установы звычайна сутыкаюцца з пацыентамі з так званай цюбінгавай траўмай.

«Часцей за ўсё паступаюць пацыенты з чэрапна-мазгавой траўмай — страсеннем. У гэтым годзе пакуль цяжкіх траўмаў у нас не было, будзем спадзявацца, што і не будзе. Але мінулыя гады паказалі, што бываюць пацыенты з пераломамі костак чэрапа, ударамі галаўнога мозгу, унутрычарапнымі гематомамі. Некаторыя траўмы патрабавалі нейрахірургічных умяшанняў», — расказаў ён.

Урач папярэдзіў, што цюбінг — вельмі каварны снарад. «Па-першае, ён развівае вельмі высокую хуткасць, значна большую, чым санкі. Па-другое, ён практычна некіравальны», — нагадаў Максім Мялешка і параіў выбіраць толькі ўладкаваныя для катання трасы.

Эксперт адзначыў, што нашым людзям усё яшчэ падабаюцца цюбінгі (у народзе вядомыя як «ватрушкі»). Іх перавага — лёгкасць. Спецыялісты кожны год нагадваюць правілы катання з горак. Калі вы прыйшлі з дзіцем і не ўпэўненыя ў крутасці спуску, то варта правесці тэст-драйв на сабе. Яшчэ нядрэнна загадзя адпрацаваць тэхніку падзення: трэба перавярнуцца на бок, пры гэтым сагнуць і падціснуць калені.

Дарэчы, летась ратавальнікі склалі цэлы спіс забароненых месцаў для катання. Такія горкі пасыпаюць пяском, а побач ставяць папераджальныя таблічкі. Так што перад паходам на спуск каля дома прыгледзьцеся — на ўсялякі выпадак.

Але звычайна снежныя горкі ўзнікаюць стыхійна, іх эксплуатацыю ніхто не кантралюе, таму неабходна выконваць правілы бяспекі. Вось яны.

1) Выбірайце для катання абсталяваныя спускі, ухіл якіх складае не больш за 20 градусаў, дзе няма дрэў, ям, грудаў, кустоў і камянёў на шляху. Унізе схілу не павінна быць вадаёма або праезнай часткі, але дастаткова месца для тармажэння.

2) Цюбінг развівае вялікую хуткасць, таму старайцеся трымаць навакольных у сваім полі зроку. Перад пачаткам спуску пераканайцеся, што перад вамі няма нікога, асабліва дзяцей. Пры спуску выконвайце чарговасць і дыстанцыю: не менш за 50 метраў або 20 секунд паміж спускам папярэдняга цюбінгу і вашым.

3) Забараняецца катацца на цюбінгу ў стане алкагольнага ап'янення, прывязваць цюбінгі да аўтамабіля або іншага транспартнага сродку, а таксама прымацоўваць цюбінгі «паравозікам»: яны могуць перакуліцца.

4) Катацца на «санках-ватрушках» трэба толькі седзячы. Забараняецца катацца на цюбінгу стоячы, лежачы або скачучы, як на батуце, з трамплінаў, ехаць спіной да схілу пры спуску.

5) Небяспечна садзіцца на цюбінг удваіх (асабліва з дзіцем), так як з яго можна вылецець: немагчыма кантраляваць сітуацыю, калі адной рукой даводзіцца трымаць дзіця, а другой цюбінг.

6) Не варта перагружаць цюбінг. У інструкцыі да спартінвентару паказана дапушчальная для кожнай мадэлі нагрузка. Выкарыстоўвайце варыянт, які падыходзіць вам па памеры, звярніце ўвагу і на ўзроставыя рамкі. Не адпускайце маленькіх дзяцей катацца адных.

І яшчэ. Калі вы напампоўвалі або падпампоўвалі цюбінг на холадзе, выпусціце частку паветра з камеры пры ўнясенні яго ў цёплае памяшканне або салон аўтамабіля. У цяпле паветра пачне пашырацца, і камера можа лопнуць, калі «ватрушка» была моцна надзьмутая халодным паветрам.

Сяргей КУРКАЧ.

Новыя кнігі

«Ад усяго сэрца, ад усёй душы»

Упершыню пад адной вокладкай сабраны аўтографы Якуба Коласа

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа сістэмна займаецца даследчыцкай, навукова-пошукавай працай. Пра гэта сведчаць многія публікацыі музейных работнікаў розных пакаленняў. Пра гэта сведчыць унікальная, са шматгадовай гісторыяй, канферэнцыя «Каласавіны». І яшчэ яскравым пацверджаннем такога пераканання з'яўляецца цэлы шэраг выданняў, арганізаваных Коласаўскім музеем. Толькі што пабачыў свет (Мінск, выдавецтва «Капітал Принт», 2023 год) каталог «Ад усяго сэрца, ад усёй душы»: дарчыя надпісы Якуба Коласа на кнігах».

Укладальнікамі па-свойму ўнікальнай (а што яшчэ важна — першай у такім кірунку!) працы з'яўляюцца кандыдат сацыялагічных навук Васіліна Міцкевіч, Наталля Шувагіна-Адамовіч. Кіраўнік праекта — дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ірына Мацяс. Рэцэнзентам выступіў доктар філалагічных навук Алесь Бельскі. Аўтарытэт такога калектыву сведчыць, што праца выканана на высокім навуковым, даследчыцкім і пошукавым узроўні.

З выдавецкай анатацыі да кнігі, якая ўражвае яшчэ і сімпатычным дызайнам, з'яўляецца прыцягальным творам кніжнага мастацтва: «Каталог «Ад усяго сэрца, ад усёй душы» — першая спроба навуковай сістэматызацыі дарчых надпісаў Якуба Коласа на кнігах. Выданне дазволіць забяспечыць навукоўцаў базай для далейшых даследаванняў у галіне літаратуразнаўства і коласазнаўства, паспрыяе папулярызацыі жыцця і творчасці класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа, дасць уяўленне аб матэрыялах, якія захоўваюцца ў фондах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Каталог прызначаны для даследчыкаў, навукоўцаў, музейных супрацоўнікаў, выкладчыкаў, настаўнікаў, для ўсіх, хто цікавіцца спадчынай народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, гісторыяй беларускай літаратуры».

Кніга складаецца з чатырох раздзелаў: «Кнігі з дарчымі надпісамі Якуба Коласа, падараваныя паэтам у 1920-я гады»; «Кнігі з дарчымі надпісамі Якуба Коласа, падараваныя паэтам у 1930-я гады»; «Кнігі з дарчымі надпісамі Якуба Коласа, падараваныя паэтам у 1940-я гады»; «Кнігі з дарчымі надпісамі Якуба Коласа, падараваныя паэтам у 1950-я гады».

Як фарміравалася калекцыя коласаўскіх аўтографаў на кнігах у музеі, расказваецца ва ўступным артыкуле да каталога (аўтары — В. Міцкевіч, Н. Шувагіна-Адамовіч): «...Міхаіль Канстанцінавіч Міцкевіч (малодшы сын Я. Коласа. — **К. Л.**) падказаў назву каталога, ведаў, што бацька заўсёды дарыў свае кнігі ад усяго сэрца і ад усёй душы, любіў надпісваць радкі на памяць чорнымі чарнілами, пяром № 86.

У фондах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа захоўваюцца 98 кніг з інскрыптамі паэта. Гэта калекцыя бярэ свой пачатак з 1962 года, калі ў фонды музея была перададзена першая кніга з аўтографам песняра ад пісьменніка і публіцыста Усевалада Азарава. Вялікую пошукавую работу ў гэтым накірунку вёў старэйшы сын Якуба Коласа, першы дырэктар музея Данііл Канстанцінавіч Міцкевіч, які добра ведаў людзей з акружэння свайго бацькі. Звыш 50 кніг з інскрыптамі Якуба Коласа папоўнілі фонды музея дзякуючы яго намаганням. Марыя Далідовіч і Наталля Шувагіна-Адамовіч спрыялі папаўненню калекцыі кнігамі з інскрыптамі паэта, якія былі адрасаваны Максіму Лужаніну. Значны ўнёсак у папаўненне фондаў зрабілі родныя, сваякі і нашчадкі паэта. Сястра Якуба Коласа Алена Міхайлаўна Лойка перадала ў фонды восем кніг з прысвячэннямі. Кнігі з дэдыкацыямі Якуба Коласа С. М. Гарадзецкаму, А. С. Новіку-Прыбою, Я. В. Астроўскаму папоўнілі збор музея дзякуючы намаганням унучак песняра Веры і Марыі Міцкевіч. У 2022 годзе ў фонды музея былі перададзены тры кнігі з аўтографамі Якуба Коласа, адрасаванымі А. А. Кетлер, дзякуючы галоўнаму захавальніку фондаў музея Васіліне Міцкевіч».

Апісанне кожнага з аўтографаў, кожнай кнігі з аўтографам уяўляе сабою сапраўднае навукова-публіцыстычнае эсэ. Напрыклад, сярод першых вядомых аўтографаў на кнігах — надпіс на зборніку апавяданняў «У цяхай вадзе» (Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925 год) Уладзіславу Чаржынскаму (1897 — 1974). Адрасат — беларускі крытык, літаратуразнаўца, які выступаў пад псеўданімам Уладзіслаў Дзяржынскі. Вось які «дарчы след» пакінуў Я. Колас на тытульным лісце кнігі: «Выдатнейшаму беларускаму літаратурнаму крытыку У. Чаржынскаму ад аўтара. Менск. 30. III. 1925 г.». Дарэчы, пра гэта мы даведваемся з тлумачальнага артыкула, Уладзіслаў Дзяржынскі напісаў пра Коласа крытычна-біяграфічны нарыс «Якуб Колас», які выйшаў у першым томе збору твораў паэта ў 1928 г., рэцэнзію на кнігу Якуба Коласа «Сымон-музыка», рэцэнзію на кнігу Якуба Коласа «У глыбі Палесся», артыкулы «Да партрэту Я. Коласа ў літаратурнай крытыцы», «Праменяцца далі», «На павароце» (тры апошнія тэксты ўвайшлі ў кнігу «Якуб Колас у літаратурнай крытыцы», якая была надрукавана ў Мінску да дваццацігадовага юбілею творчай дзейнасці народнага песняра). Уладзіслаў Вікенцьевіч быў арыштаваны 28 чэрвеня 1930 года. Крытыка выслалі ў Казань тэрмінам на пяць гадоў. Пасля арышту і высылкі даследчык адышоў ад літаратурнай дзейнасці, працаваў выкладчыкам у розных ВНУ. У 1940—50-я гады перапісваўся з Якубам Коласам. Такое лаканічнае эсэ самым падрабязным чынам ілюструе гісторыю адносін паэта і адрасата, якому скіраваны дарчы надпіс. А яшчэ і пашырае нашы ўяўленні пра таго самага У. Дзяржынскага. Мо некаму з літаратуразнаўцаў гэты тэкст, зварот да ўзаемаадносін паэта і крытыка нагадае, што даўно наспела патрэба перавыдаць творы забытага літаратуразнаўца..?

Прататыпам Алеся Садовіча ў трылогіі «На ростанях» і Баса-Грэнкі ў п'есе «Забастоўшчыкі» Якуба Коласа, а таксама доктара Сташынскага ў рамане Аляксандра Фадзеева «Разгром» быў Аляксандр Сянкевіч (1884—1934) — беларускі дзяржаўны і партыйны дзеяч, вучоны, пісьменнік, наркам аховы здароўя рэспублікі ў першыя гады Савецкай улады на Беларусі. Яго сыну — Георгію Сянкевічу — Якуб Колас дорыць зборнік апавяданняў «Крок за крокам» (Менск, Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925) з такім надпісам: «Жоржыку Сянкевічу ад Якуба Коласа. 13.IV.1925 г.».

За кожным апісаннем аўтографаў схаваны не проста адметныя, цікавыя лёсы, за кожным апісаннем, якія згодна задачам выдання і з'яўляюцца даволі лаканічнымі, але пры гэтым выглядаюць насычанымі, даволі багатымі на каментарыі да самога факту дарэння, паўстаюць проста ўнікальныя гісторыі. Дзякуючы гэтаму каталог з'яўляецца новым, энергетычным грунтам для развіцця, пашырэння новай прасторы коласазнаўства. Пятро Глебка, Максім Лужанін, Міхась Лынькоў, Сяргей Гарадзецкі... Аўтографы, адрасаваныя пісьменнікам, грамадскім дзеячам, проста звычайным людзям, — гэта яшчэ і гісторыя іх адносін з Якубам Коласам. Апісанне дарчых надпісаў багата ілюстравана, насычана рознымі мастацкімі дакументамі, творамі, прысвечанымі тым людзям, каму класік беларускай літаратуры надпісваў свае кнігі.

Праца, праробленая ўкладальнікамі Васілінай Міцкевіч і Наталляй Шувагінай-Адамовіч, — яркі ўзор наступнікам у накірунку да стварэння падобных навукова-творчых праектаў. Беларускае літаратуразнаўства, несумненна, патрабуе апісання аўтографаў, дарчых надпісаў Міхася Лынькова, Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Кандрата Крапівы, Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Максіма Танка, іншых народных паэтаў і народных пісьменнікаў Беларусі.

Каталог «Ад усяго сэрца, ад усёй душы» — яшчэ і ўклад у беларускае бібліяфільства, напамін пра тое, якім цікавым з'яўляецца беларускае кніжніцтва як з'ява нацыянальнай культуры Беларусі.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Майстар хлебнага мастацтва

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Увогуле, цяжка пералічыць усе ўзнагароды аршанкі, бо амаль кожны год Марына Марозава становіцца прызёрам разнастайных кулінарных конкурсаў нацыянальнага і міжнароднага маштабу. Па словах **начальніка лабараторыі Аршанскага хлебазавода Алены КУТУЗАВАЙ,** спецыялісты традыцыйна бяруць удзел у выставах і конкурсах, што з'яўляецца выдатным стымулам для самаўдасканалення і павышэння прафесійнага ўзроўню. «Мы падтрымліваем творчы энтузіязм моладзі, а кандытары і хлебапёкі, імкнучыся да перамогі, павышаюць прэстыж прадпрыемства», — падкрэсліла Алена Кутузава.

Мастацкая работа «Захавальнік лесу», якая стала пераможцам, вырабляласа два тыдні. Фантазіі шмат, але час быў абмежаваны. Майстар імкнулася скрупулёзна перадаць дэталі, карані, грыбы, лісце і іншыя элементы вобраза, без якіх гэты шэдэўр з цеста быў бы не такім захапляльным. Разглядаючы хлебны твор дэталёва, не верыцца, што ўсе яго элементы зроблены з цеста, а гэта — сур'ёзная ювелірная работа Марыны. Казачны лесавік у шляпе, які ганарліва сядзіць на пні, адразу пакарыў журы.

«Адна справа — за кароткі тэрмін вырабіць усе дробныя дэталі, з якіх складаецца агульны вобраз, другая — падабраць правільныя фарбавальнікі, прапрацаваць цені, маршчыны і вочы цэнтральнага персанажа. У гэты момант адчуваеш сябе сапраўдным мастаком, а твой твор літаральна ажывае, таму і прыцягвае ўвагу», — дзеліцца сакрэтамі фармоўшчык.

Імя Марыны Марозавай залатымі літарамі ўжо ўпісана ў гісторыю Аршанскага хлебазавода, як і кандытара Наталлі Самбук. Гэты жаночы тандэм прадстаўляе Аршаншчыну на ўсіх кулінарных спаборніцтвах, прывозячы высокія ўзнагароды. Такія апантаныя, натхнёныя людзі з'яўляюцца галоўнай каштоўнасцю любой вытворчасці.

Адметна, што на выставе-кірмашы «Прадэкспа-2023» у рамках Рэспубліканскага агляду якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Смаката» ў намінацыі «Хлеб з жытняй або сумесі жытняй і пшанічнай мукі» Гран-пры атрымалі аршанскія хлябы «Хлеб^ОК» аржаны з водарам мёду, «Хлеб^ОК» аржаны з кунжутам і «Хлеб^ОК» аржаны духмяны. У іншых намінацыях Гран-пры атрымала печыва «Любімае з макам», залатымі медалямі адзначаны булка «Маладзецкая» і торт «Салёная карамель».

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з архіва гераіні.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Нігер анулюваў ваеннае партнёрства з Еўрасаюзам

Афрыканская краіна адклікала дазвол на разгортванне місіі ў горадзе Ніямей. Аб гэтым паведаміла ТАСС. Як вядома, місію EUCAP Sahel Niger заснавалі ў 2012 годзе. Па звестках знешнепалітычнай службы Еўрасаюза, мэта місіі — умацаванне сектара ўнутранай бяспекі Нігера. Еўрасаюз зробіць «аперацыйныя высновы» з рашэння ўлад Нігера. Пра гэта гаворыцца ў заяве вярхоўнага прадстаўніка ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Жазэпа Барэля. Разам з тым, паводле інфармацыі агенцтва ANP, днямі міністр абароны Нігера генерал Саліфу Модзі і намеснік кіраўніка расійскага ваеннага ведамства генерал-палкоўнік Юнус-Бек Яўкураў падпісалі дакумент, які накіраваны на ўмацаванне партнёрства ў сферы абароны. Раней у лістападзе ў Нігеры група вайскоўцаў падняла мяцеж і заявіла, што прэзідэнт Махамед Базум адхілены ад улады. Для кіраўніцтва краінай сфарміравалі Нацыянальны савет выратавання. У кастрычніку Еўрасаюз паведаміў аб стварэнні механізма ўвядзення аднабаковых санкцый, накіраваных супраць Нігера.

У Румыніі аб'явілі аб эпідэміі адзёру

Аб гэтым паведаміў афіцыйны сайт Міністэрства аховы здароўя краіны. «Улічваючы трывожны рост захворвання на адзёр, а таксама вялікую колькасць шпіталізацый у педыятрычных і інфекцыйных аддзяленнях інфіцыраваных дзяцей, Міністэрства аховы здароўя Румыніі аб'яўляе нацыянальную эпідэмію адзёру, каб забяспечыць магчымасць вакцынацыі дзяцей ва ўзросце 9-11 месяцаў, а таксама лячэння непрышчэпленых або не поўнасцю прышчэпленых дзяцей», — адзначаецца ў паведамленні. У Румыніі зарэгістравана амаль дзве тысячы выпадкаў захворвання на адзёр у 29 паветах. Міністэрства аховы здароўя краіны адзначыла, што першую дозу вакцыны атрымала каля 80 працэнтаў дзяцей, а другую — звыш 60. У ведамстве таксама падкрэслілі, што на працягу апошніх дзесяці гадоў колькасць прышчэпленых дзяцей у краіне зніжаецца.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 СНЕЖНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 23 (15967)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Марыя ГНЕДЧЫК:

«Іншыя спартсмены займаюцца адным і тым жа. А ў мяне ўсё і адразу»

Фехтаванне, плаванне, язда на кані (сярод спецыялістаў — канкур), бег і стральба — кожны з гэтых відаў спорту патрабуе шмат часу і сіл. Але ёсць людзі, якім па сілах іх аб'яднаць. Сучаснае пяціборства — спорт унікальны. А людзі, якія ім займаюцца, — увасабленне моцы і мужнасці. Нават калі гэта маладыя далікатныя дзяўчаты з эфектнымі малінавымі валасамі. Марыі Гнедчык няма яшчэ і 20 гадоў, але яна ўжо зарэкамендавала сябе як моцная пяціборка. І пацвердзіла гэта на II Гульнях краін СНД, якія прайшлі сёлета ў Беларусі. Марыя стала чэмпіёнкай у асабістым і камандным заліках, а таксама ў жаночай эстафеце. І гэта зусім не адзінкавы трыумф маладой спартсменкі. Зрэшты, калі прыняць да ўвагі, што мама Марыі — майстар спорту СССР па лёгкай атлетыцы, а тата — па вольнай барацьбе і ўся сям'я жыве спортам, то і дзівіцца няма чаму. Але ўсё ж...

Пра тое, як жыць спортам, пераносіць залімітавыя нагрузкі і пры гэтым заўсёды заставацца на пазітыве, суразмоўніца расказала ў інтэрв'ю.

Фота Бел ТА.

— Марыя, гэта праўда, што твая спартыўная кар'ера пачалася з лыж?

— Можна і так сказаць. Адным цудоўным зімовым днём я ўбачыла па тэлевізары спаборніцтвы па біятлоне. І мяне як маланкай ударыла: хачу навучыцца катацца на лыжах. Мама не пярэчыла, бо ўсе мае захапленні і ідэі заўсёды падтрымлівае. Яна лёгкаатлетка, мусіць, меркавалася, што я буду займацца гэтым жа. Але сваёй думкі мне не навязвала. Знайшоўся і цудоўны трэнер, мне вельмі падабалася атмасфера ў групе, трэніроўкі былі вельмі цікавымі. Я каталася на лыжах, удзельнічала і нават перамагала ў «Снежным снайперы», спартакіядах школьнікаў, першынствах краіны. Недзе перамагала, недзе была другая. Дзяцінства наогул было вельмі спартыўным, і, акрамя лыж, я яшчэ і кросы бегала.

— І ў які момант у жыцці з'явілася сучаснае пяціборства?

— Мама як сапраўдны спартыўны менеджар пастаянна маніторыць цікавыя спаборніцтвы. У 2016 годзе яна заявіла мяне і брата на рэспубліканскія спаборніцтвы па біятле (плаванне і бег) і трыятле (плаванне, бег і стральба). І мы з Акімам выйгралі! А літаральна праз тыдзень Беларуская федэрацыя сучаснага пяціборства прапанавала нам паехаць на чэмпіянат Еўропы па трыятле ў Партугаліі. Ну, натуральна, мама не адмовіла. Мне вельмі падабаецца біятл і трыятл, я б цяпер з задавальненнем выступала ў гэтых дысцыплінах. Але ўсё ж гэта не пяціборства. У 2019 годзе выступала на чэмпіянаце свету па лазер-ране (бег са стральбой), які праходзіў у рамках чэмпіянату свету па сучасным пяціборстве. Пасля сваіх спаборніцтваў аказалася на спаборніцтвах пяціборцаў. І калі я ўбачыла, як наша Анастасія Пракапенка (бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне) едзе на кані, у галаве нібы нешта пстрыкнула, як калісьці з лыжамі. Я зразумела, што таксама хачу паспрабаваць сябе ў пяціборстве. Ну і закруцілася. Конь — мая любімая жывёла, таму атрымліваецца, што любоў да іх прывяла мяне ў пяціборства.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Дыялог на роўных

ШКОЛА ЛІДАРСТВА ДЛЯ БУДУЧАГА ПЕДАГОГА

«Што б вы сказалі сабе, студэнту, калі б змаглі на машыне часу вярнуцца ў мінулае?» — запыталіся студэнты ў рэктара Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Аляксандра ЖУКА. Сустрэча кіраўніка ВНУ са студэнцкім актывам сабрала лідараў пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі, Студэнцкага савета БДПУ, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, маладзёжнага крыла Беларускага саюза жанчын, старастаў вучэбных груп, цьютараў, валанцёраў, байцоў студэнцкіх атрадаў, удзельнікаў «Зорных паходаў»...

У сваім уступным слове рэктар расказаў пра тое, як развіваецца ўніверсітэт, які мае статус вядучага педагагічнага ўніверсітэта краіны і рыхтуецца ў наступным годзе адзначыць сваё 110-годдзе.

Планаваць і мысліць стратэгічна

— Ганаровану статусу трэба адпавядаць. Неабходна штодня сваімі справамі пацвярджаць права быць вядучай педагагічнай ВНУ — сваімі поспехамі і дасягненнямі ў вучэбнай, навуковай, спартыўнай, культурнай, творчай, валанцёрскай і працоўнай дзейнасці, — падкрэсліў, звяртаючыся да студэнтаў, Аляксандр Жук. — Мы — адзіная ВНУ ў краіне, узнагароджаная прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Так высока былі ацэнены развіццё і папулярызацыя валанцёрскага руху сярод студэнцкай моладзі ў нашай ВНУ. Пагадзіцеся, што актыўны ўдзел будучых педагогаў у валанцёрскай дзейнасці спрыяе фарміраванню ў іх не толькі прафесійных кампетэнцый, але і актыўнай грамадзянскай пазіцыі, развіццю духоўна-маральных і гуманістычных каштоўнасцяў, засваенню найважнейшага сацыяльнага досведу.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

У ліку найлепшых

«ЭЎРЫКА»: АД АЭС ДА КАСМАДРОМА

Гэта і вялікі гонар, і вельмі карысны вопыт

Студэнцкі атрад «Эўрыка» імя Героя Савецкага Саюза В. І. Еранько Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай не першы год утрымлівае званне найлепшага студэнцкага атрада краіны. Сёлета полацкія байцы зноў пацвердзілі сваё ганаровае званне, стаўшы найлепшым студэнцкім атрадам, які працаваў на аб'екце будаўніцтва, якому прысвоены статус Усебеларускай або абласной маладзёжнай будоўлі. Аб буднях «Эўрыкі» «Чырвонцы. Чырвонай змене» расказала камісар атрада Дар'я ЯЦКЕВІЧ.



Дзяўчына, дарэчы, другі год запар атрымлівае званне найлепшага камісара на рэспубліканскім узроўні. Пяцікурсніца інжынерна-будаўнічага факультэта ПДУ праводзіць у байцоўцы апошні год, за плячыма — тры адпрацаваныя летнія сезоны на беларускіх і расійскіх аб'ектах, а яшчэ цвёрдая ўпэўненасць у тым, што студэнцкі рух як нельга ўдала вучыць камандной рабоце і дапамагае знайсці сяброў на доўгія гады.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 12 2023 г.

Не вучобай адзінай

ІМЯ ІМ — ДОБРЫЯ СЭРЦЫ!

Пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года — Добрае Сэрца — 2023» назвалі напярэдадні Міжнароднага дня добраахвотніка. У Мінску каля навагодняй ёлкі гандлёвага цэнтра «Сталіца» прайшла ўрачыстая цырымонія ўшаноўвання найлепшых з іх.

Конкурс праходзіў з 1 кастрычніка да 24 лістапада ў тры туры: раённы, рэгіянальны, рэспубліканскі. Саюз моладзі даў магчымасць удзелу ў праекце валанцёрам руху БРСМ «Добрае Сэрца» з усіх куткоў Беларусі ў розных узроставых катэгорыях (навучэнская, студэнцкая, працоўная моладзь у індывідуальных намінацыях, валанцёрскія атрады — у камандных намінацыях).

Аргкамітэт разгледзеў 113 конкурсных работ, якія паступілі на рэспубліканскі тур конкурсу, і вызначыў пераможцаў. У склад экспертнага журы ўвайшлі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, ЦК БРСМ, Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра, Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства, Беларускага Чырвонага Крыжа, а таксама Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра.

Так, у намінацыях «Асабісты ўклад» перамогу ў рэспубліканскім конкурсе атрымалі: Вераніка Тычына (сярэдняя школа № 13 Слуцка), Кірыл Парфенцьеў (Слуцкі дзяржаўны індустрыяльны каледж), Дзіяна Гарыслаўская (Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт), Цімафей Караневіч (ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК»).

У намінацыі «Найлепшы валанцёрскі атрад» — валанцёрскія атрады «Цяпло сэрцаў» (сярэдняя школа № 14 Маладзечна), «Зорка» (сярэдняя школа № 9 Оршы), «З Д» (Добрушскі дзяржаўны політэхнічны каледж) і «Ад сэрца да сэрца» (Беларуска-Расійскі ўніверсітэт).

Акрамя таго, пераможцамі ў намінацыі «Добро ў кадры» сталі Мікіта Місцюк (сярэдняя школа № 35 імя М. А. Волкава Гродна) і Уладзіслаў Белавус (Жамчужанская сярэдняя школа Баранавіцкага раёна), а таксама ў намінацыі «Найлепшая распрацоўка «роўны навучае роўнага» — Настасся Чубан (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка).

Сёлета перамогу ў спецыяльнай намінацыі «Сэрца на далоні» падзялілі валанцёры Ангеліна Сільвановіч (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка) і Кацярына Леўкавец (Сацыяльна-гуманітарны каледж УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»).

Акрамя асноўных намінацый, заслужаныя падзякі за самаадданую працу і асабісты ўклад уручылі найлепшым валанцёрам II Гульняў краін СНД — іх атрымалі васьмёра добраахвотнікаў.

Нагадаем, валанцёрскі рух БРСМ «Добрае Сэрца» — адзін з вядучых напрамкаў дзейнасці Саюза моладзі. Ён аб'ядноўвае па ўсёй краіне 33 957 юнакоў і дзяўчат у 2047 валанцёрскіх атрадах. А галоўная задача конкурсу, арганізатарам якога выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, — папулярызацыя і развіццё ў краіне валанцёрскага руху, павышэнне статусу добраахвотніка, выяўленне і заахвочванне лідараў руху, якія праводзяць грамадскую і сацыяльна значную дзейнасць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШКОЛА ЛІДАРСТВА ДЛЯ БУДУЧАГА ПЕДАГОГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

БДПУ паспяхова вырашае задачу якаснай падрыхтоўкі сучасных педагогаў для нацыянальнай сістэмы адукацыі. І не толькі: у нашай ВНУ навучаюцца і 800 замежных студэнтаў... Мы ініцыявалі важны праект, які быў падтрыманы на рэспубліканскім узроўні — па стварэнні ва ўсіх рэгіёнах «Бацькоўскіх універсітэтаў». Школа і сям'я павінны займацца выхаваннем дзіцяці ў тандэме. Бо калі настаўнік кажа і транслюе дзецям на занятках і па-за ўрокамі адны каштоўнасці, а дома дзеці чуюць і адчуваюць іншае, то пра якое выхаванне можа весціся гаворка?

«Прафесія педагога ўнікальная. Устойлівая будучыня забяспечваецца якаснай, самаадданай і адказнай работай кожнага з нас. Гэта не высокія словы, а рэчаіснасць, — разважае Аляксандр Жук. — Работа настаўніка патрабуе стрэсаўстойлівасці і псіхалагічнай падрыхтоўкі. Невыпадкова мы стварылі па ўсёй краіне сетку з 800 педагагічных класаў, бо клапоцімся пра тое, каб да нас ва ўніверсітэт прыходзілі матываваныя абітурыенты, ужо знаёмыя з педагогікай.

Усе, хто сабраўся ў гэтай зале, больш чым проста будучыя педагогі. Вы тут і цяпер фарміруеце тыя лідарскія якасці, якія дазволяць вам у будучыні быць не толькі настаўнікамі, але і займаць пасады дырэктараў устаноў адукацыі, іх намеснікаў. Гэта ўменне працаваць у камандзе, планаваць і мысліць стратэгічна, гатоўнасць прымаць хуткія рашэнні, нестандартнасць, уменне выходзіць за рамкі, крэатыўнасць, эмпатыя...

Многія нашы выпускнікі, якія прайшлі школу грамадскай актыўнасці, пазней праявілі сябе ўжо як кіраўнікі на самым высокім узроўні. Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём Цуран — выпускнік факультэта пачатковай адукацыі педуніверсітэта. Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка — таксама выпускнік нашага гістарычнага факультэта. Да гэтага ён быў міністрам адукацыі, намеснікам старшыні Мінгарвыканкама, прарэктарам БДПУ. Гэтыя прыклады — сведчанне таго, што педагагічная адукацыя забяспечвае вельмі рознабаковае фарміраванне асобы».

Не апускаць для сябе планку

Адказваючы на пытанне пра вандроўку ў часе, Аляксандр Жук зазірнуў у сваё дзяцінства і расказаў, што выбіраючы прафесію і месца вучобы пасля школы, ён стаяў перад дылемай — аддаць перавагу тэхніцы або матэматыцы.

— Мой бацька быў кіроўцам, таму я з пяці-шасці гадоў часта сядзеў у кабіне яго машыны і імітаваў паездку за рулём. Любоў да тэхнікі прайшла праз усе школьныя гады. З іншага боку, дзякуючы сваёй настаўніцы матэматыкі, я палюбіў дакладныя навукі. Першы варыянт быў звязаць свой лёс з аўтатэхнікай і пайсці на аўтатрактарны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (цяпер гэта БНТУ). Другі — механіка-матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У гэты бок я ў выніку і схіліўся, хоць падказаць мне на той момант не было каму.

Паколькі быў залатым медалістам, то замест чатырох экзаменаў здаваў адзін вусны — па матэматыцы. Шчыра кажу, гэта быў няпросты экзамен, дзе трэба было прадэманстраваць вельмі важнае ўменне — даказваць тэарэмы. Гэта тое, чаго не хапае сённяшнім выпускнікам школ. А для матэматыкаў логіка і доказ — краевугольны камень.

Першакурснікі мяне зразумеюць, што калі ва ўніверсітэце пачынаецца вышэйшая матэматыка — вучыцца вельмі няпроста. Галоўнае — нічога не прапускаць, не расслабляцца, каб не прыйшлося даганяць. А потым становіцца лягчэй. Таму я і прашу дэканаў, студэнтаў-цьютараў дапамагчы нашым навабранцам адаптавацца да адукацыйнага працэсу. Універсітэт усё ж такі не школа... А калі ты пачынаеш добра вучыцца, то потым становіцца проста няёмка нават самаму перад сабой апускаць гэту планку. Вы ж ведаеце, што з пэўнага часу заліковая кніжка пачынае працаваць на рэпутацыю студэнта. Дык вось я б сёння сказаў сабе, першакурсніку, што трэба шмат працаваць. Калі будзеш працаваць, то будзе і вынік. Цяпер я гэта ведаю дакладна... І сёння, і заўтра будуць цаніцца прафесіяналізм, таму, чым бы вы ні займаліся, рабіце ўсё так, каб вам не было соромна.

Якой бачыцца школа будучыні

Трэба заўважыць, што на механіка-матэматычным факультэце былі два патокі — навукова-вытворчы і навукова-педагагічны. Аляксандр Жук абраў апошні. Некаторы час ён працаваў у БДУ выкладчыкам, потым паступіў у аспірантуру педінстытута, пісаў кандыдацкую дысертацыю па методыцы выкладання матэматыкі. Затым вярнуўся ў альма-матар. Стваряў Ліцэй БДУ — навучальную ўстанову нова га тыпу, быў першым яго дырэктарам. Гэта быў вельмі цікавы час, калі ўсё рабілася з нуля. Не было будынка для ліцэя, настаўнікаў, навучэнцаў... А сёння Ліцэй БДУ — шматпрофільная паспяховая навучальная ўстанова, вядомая на ўсю краіну. Потым ён быў рэктарам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі (цяпер АПА). Абараніў доктарскую. Быў прарэктарам БДУ. 13 гадоў працаваў першым намеснікам міністра адукацыі. А з 2014 года ўзначальвае БДПУ.

«А якой вы бачыце школу будучыні?» — пацікавіліся студэнты ў свайго рэктара.

— Ключавой фігурай у ёй усё роўна застанецца педагог, — упэўнена адказаў Аляксандр Жук. — У Расіі Агенцтва стратэгічных ініцыятыў дзесяць гадоў таму распрацавала Атлас прафесій будучыні. У сферы адукацыі там фігуравалі, напрыклад, такія як гульнявы майстар, цьютар, медыятар, арганізатар праектнага навучання, распрацоўшчык адукацыйных траекторый, экапрапаведнік. У той час здавалася, што гэта справа далёкай будучыні. Але вы ва ўніверсітэце ўжо асвойваеце ўсе гэтыя ролі. Мы не будзем называць іх новымі педагагічнымі прафесіямі. Так, развіццё тэхналогій мяняе нашы ўяўленні аб спосабах атрымання ведаў і прымушае сур'ёзна пераасэнсаваць звыклы падыход да навучальнага працэсу. Новыя тэхналогіі дазваляюць індывідуалізаваць адукацыйны працэс. Цяпер працэс навучання дастаткова лёгка адаптуецца да запытаў канкрэтнага вучня і яго асаблівасцяў.

Мы маем справу з пакаленнем, якое думае па-іншаму і па-іншаму ўспрымае інфармацыю. Жывём у лічбавым свеце, і ўсе новыя рэсурсы будуць у дапамогу педагогу, але ніякі штучны інтэлект настаўніка не заменіць. Выхаваўчы працэс не паддаецца алгарытмізацыі і камп'ютарызацыі. Усё гэта застанецца за педагогам...

«Якой, па вашым меркаванні, павінна быць сучасная лекцыя, адрасаваная будучым педагогам?» — працягвала цікавіцца студэнцкая моладзь.

— Маналагічныя лекцыі сыходзяць у мінулае, лекцыі пад дыктоўку — гэта ўжо нават не ўчарашні дзень, — падзяліўся сваім бачаннем Аляксандр Жук. — Сёння мы выкарыстоўваем інтэрактыў, дадатковую рэальнасць, электронныя рэсурсы, распрацаваныя нашымі выкладчыкамі. Дарэчы, пандэмія каранавіруса стала для нас добрым штуршком. Увогуле, місія выкладчыка змянілася. У новых стандартах мы скарацілі колькасць лекцыйных заняткаў. Задача выкладчыка — даць мінімальную інфармацыю, але падаць яе праблемна, каб нацэліць студэнтаў на самастойны пошук дадатковай інфармацыі. Веды нельга даць, іх можна толькі ўзяць. І менавіта выкладчык матывуе сваіх студэнтаў на пошук патрэбных ведаў.

Уклад ва ўласнае развіццё

Закранулі студэнты і тэму навукі. **Як не памыліцца з выбарам перспектыўнага кірунку ў навуковай дзейнасці?**

— Вы павінны разумець, што педагог павінен быць даследчыкам, — адказаў рэктар. — Яму неабходна пастаянна вывучаць адукацыйную сітуацыю ў сваім класе, прычыны непаспяховасці вучняў, што неабходна зрабіць, каб выправіць становішча. Вось чаму мы вялікую ўвагу ўдзяляем падчас падрыхтоўкі будучых настаўнікаў даследчай рабоце, пачынаючы літаральна з першага курса. У нашым універсітэце дзейнічаюць 40 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый. Канешне, у выбары тэмы вялікую ролю адыгрывае навуковы кіраўнік. Таму вельмі важна знайсці свайго навуковага кіраўніка! Чаму мы вярнулі для ўсіх дыпломныя работы на выхадзе з універсітэта? Каб на момант заканчэння першай ступені вышэйшай адукацыі вы разумелі, што такое даследчая работа.

Ва ўніверсітэце распрацавалі поле для псіхолага-педагагічных даследаванняў, яно мае 17 кірункаў па ключавых пытаннях развіцця псіхолага-педагагічных навык: гэта і асаблівасці мыслення прадстаўнікоў лічбавага пакалення, інклюзія, прафільнае навучанне і гэтак далей. Але майце на ўвазе, што калі гісторыкам дастаткова пасядзець у архіве, каб напісаць навуковую працу, то ў педагогіцы ўсё нашмат складаней — патрабуецца аўдыторыя для правядзення эксперымента: школьнікі, навучэнцы, студэнты...

Падводзячы вынікі сустрэчы са студэнцкім актывам, Аляксандр Жук падкрэсліў, што ўдзел у грамадскім жыцці ўніверсітэта — неабходны элемент падрыхтоўкі прафесіянала. «Той, хто кажа, што грамадская работа адцягвае ўвагу ад вучобы, не мае рацыі. Кожны настаўнік, які заходзіць у клас, гэта і арганізатар, і чалавек, які павінен валодаць навыкамі кіраўніцкай дзейнасці. Што такое работа важатага ў аздараўленчым лагеры? Гэта работа 24 гадзіны сем дзён у тыдзень. Работа з дзецьмі, іх бацькамі, работа вельмі няпростая. Жыццё пастаянна падкідвае шмат педагагічных задач, на якія трэба граматна рэагаваць, і рабіць гэта трэба хутка. Калі яшчэ падчас навучання ва ўніверсітэце вы займаецеся і грамадскай актыўнасцю, то робіце важны ўклад ва ўласнае развіццё. Пастарайцеся ўзяць максімум ад студэнцкіх гадоў, — параіў моладзі рэктар. — Я заўсёды падтрымліваў актывістаў. Прыходзьце са сваімі праектамі, падказвайце. Наш універсітэт — адна вялікая каманда. А калі ты ў камандзе, можаш зрабіць значна больш...»

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота прэс-службы БДПУ.

Даніна пашаны

«СПАДЧЫНА» Ў СЦЕНАХ ЛЕГЕНДАРНАЙ КРЭПАСЦІ

Запрацавалі гарачыя лініі для ахвотных прыняць удзел у патрыятычным праекце

У лістападзе ў Брэсцкай крэпасці далі старт будаўніцтву Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі. У аб'екта — статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. І першым на працоўную вахту заступіў студатрад «Спадчына».

Цэнтр будзе на легендарным Кобрынскім умацаванні ў казарме 1930-х гадоў. Пасля адкрыцця тут чакаюць моладзь з усёй краіны. Сваё жаданне пабываць тут выказалі таксама хлопцы і дзяўчаты з Санкт-Пецярбурга, Курска, Цюмені, Пензы і Чачэнскай Рэспублікі.

Студэнт брэсцкай тэхнічнай ВНУ Сямён Люлькоўіч, кіраўнік будатрада «Спадчына», разам з таварышамі ўжо вынес каля ста тон смецця. Байцы займаліся дэмантажом падлог у казармах, ачысткай падвальных памяшканняў. Ганаровая місія выканаць першыя работы на такім аб'екце выпала «Спадчыне» не проста так. Менавіта Сямён Люлькоўіч звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай даверыць БРСМ удзел у стварэнні патрыятычнага цэнтра і аб'явіць будаўніцтва Усебеларускай маладзёжнай будоўляй.

У заступіўшага на працоўную вахту 11 лістапада студэнцкага будаўнічага атрада «Спадчына» імя Героя Савецкага Саюза П. М. Машэрава працоўную эстафету на маладзёжнай будоўлі 4 снежня прынялі будатрады «Стахановцы» імя Героя Беларусі У. М. Карвата (сфарміраваны штабам працоўных спраў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна) і «Аэліта» імя Героя Сацыялістычнай Працы рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А. Н. Сеўчанкі (сфарміраваны штабам працоўных спраў БДУ).

Больш за 400 тон пяску і каля 70 тон смецця трэба яшчэ прыбраць з сутарэнных памяшканняў. Потым будзе рэканструкцыя навучальнага корпуса, які захаваюць у гістарычным выглядзе — са слядамі куль і асколкаў. Тут размесцяць кабінеты і пакоі з месцамі для пражывання. Апроч будынка, абновіцца і тэрыторыя Кобрынскага ўмацавання са з'яўленнем на ёй спартыўнага ядра цэнтра.

У Цэнтральным камітэце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі пачалі працаваць гарачыя тэлефонныя лініі па фарміраванні добраахвотніцкіх атрадаў для ўдзелу ў працоўных акцыях на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці. Аб'ём работ на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі дастаткова вялікі, таму патрэбна і іх дапамога.

Улічваючы вялікую колькасць зваротаў адносна таго, як далучыцца да маладзёжнай ініцыятывы (прычым не толькі ад моладзі), пры ЦК БРСМ і былі адкрыты гарачыя тэлефонныя лініі.

Кожны чалавек або працоўны калектыў, які жадае зрабіць свой уклад у будаўніцтва Цэнтра выхавання маладых патрыётаў, можа звярнуцца па тэлефонах: 8 (017) 371-05-43 і 8 (025) 799-63-54. Час работы гарачых ліній — з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 18.00 у буднія дні.

Працягваецца і збор сродкаў на добраўпарадкаванне патрыятычнай лакацыі. Дапамагчы гэтай добрай справе можа кожны. Адкрыты дабрачынны рахунак, куды паступаюць сродкі ад арганізацый і грамадзян. Ужо ёсць больш за мільён шэсцьсот тысяч рублёў. Уклад у гэта зрабілі і простыя людзі, і арганізацыі.

Патрыятычны цэнтр у сценах легендарнай крэпасці расчыніць свае дзверы ў 2025-м — у юбілейны год Вялікай Перамогі.

Нагадаем, што аб'ектам будаўніцтва адукацыйна-аздараўленчай установы «Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі» на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці прысвоены статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў адпаведнасці з Указам № 257 Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, які быў падпісаны 9 жніўня. Згодна з ім, да работ на гэтых аб'ектах будуць прыцягнуты маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года, у тым ліку ў складзе студэнцкіх атрадаў.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Лакацыі актыўнасці

Стаўка — на глыбокія веды права

У Беларусі стартаваў трэці сезон рэспубліканскага прававога турніру «Сіла закона» для старшакласнікаў.

Тэма сёлетняга — «Народаўладдзе ў Рэспубліцы Беларусь. Традыцыі, сучаснасць, будучыня». Для ўдзелу ў ім былі запрошаны навучэнцы 9—11-х класаў. Школьнікам трэба самастойна пісьмова адказаць на 40 тэматычных пытанняў.

Праект будзе рэалізаваны ў тры туры: першы, раённы, завяршыўся ўчора; другі, абласны (Мінскі гарадскі), адбудзецца 14 снежня; фінальны, рэспубліканскі, запланаваны на другую палову снежня.

Праект накіраваны на прававую асвету юнакоў і дзяўчат, фарміраванне прававой культуры непаўналетніх, іх адукаванасць, актыўнасць і мабільнасць. Арганізатарамі выступаюць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, Міністэрства адукацыі пры падтрымцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

За два сезоны прававы турнір аб'яднаў больш за 37 тысяч чалавек. Маладыя людзі на час выконваюць тэставыя заданні і паказваюць сваю зацікаўленасць. Каб стаць пераможцам у сябе ў раёне, вобласці, а таксама ў краіне, удзельнік павінен мець глыбокія веды права.

Як адзначаюць арганізатары, мэтанакіраванасць і адказнасць, фундаментальныя веды сваіх правоў і абавязкаў дазваляюць моладзі паспяхова пакарыць новыя вяршыні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Камертон настрою

У КАГО ВАСТРЭЙШАЕ ПЯРО І ЦІКАВЕЙШЫ БЛОГ?

Імёны пераможцаў другога сезона рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код» сярод друкаваных і электронных сродкаў масавай інфармацыі будуць аб'яўлены 15 снежня. Найлепшых з іх два дні выбіралі ў Мінску ў Рэспубліканскім доме моладзі.

Конкурс, у якім удзельнічалі маладыя журналісты і блогеры, завершаны. Усяго на адрас аргкамітэта паступіла 341 заяўка. Усе аўтарскія работы былі разгледжаны падчас другога тура конкурсу. Кожны намінант на перамогу прайшоў асабістую абарону свайго аўтарскага матэрыялу на рэгіянальным узроўні. У фінал конкурсу — на рэспубліканскі этап — выйшлі 74 аўтарскія работы. Членам журы трэба было выбраць пераможцаў у дзвюх узроставых групах — ад 16 да 21 года і ад 22 да 31 года.

У фінальным туры ўсе прэтэндэнты на перамогу зноў асабіста баранілі свае работы. 47 маладых журналістаў у катэгорыі «Электронныя СМІ і інтэрнэт-рэсурсы» змагаліся за перамогу ў намінацыях «Найлепшы відэасюжэт аб памятных мясцінах Беларусі, вядомых людзях, знамянальнай падзеі», «Найлепшы відэаблог», «Найлепшая аператарская работа», «Найлепшы праект у новых медыя». У катэгорыі сярод друкаваных СМІ, якую прадстаўлялі 27 маладых аўтараў, творчае спаборніцтва ішло ў намінацыях «Найлепшыя аўтарскія матэрыялы» (рэпартаж, спецыяльны праект патрыятычнай тэматыкі), «Найлепшая карыкатура па найбольш востры сацыяльнай тэматыцы», «Найлепшы фотарэпартаж». Імёны пераможцаў другога сезона рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код» будуць агучаны ў рамках праграмы Форуму маладых журналістаў. Яго арганізатарам выступае Міністэрства інфармацыі.

Другі сезон рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код» стартаваў 15 ліпеня на палях рэспубліканскага медыяфоруму БРСМ PROdigital. Праект рэалізоўваецца Міністэрствам інфармацыі і ЦК БРСМ з мэтай рэалізацыі задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і садзейнічання станаўленню прафесійных маладых журналістаў сродкаў масавай інфармацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ЭЎРЫКА»: АД АЭС ДА КАСМАДРОМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Даша трапіла ў «Эўрыку» на другім курсе дзякуючы знаёмствам з ужо бывалымі «ветэранамі» студатрадаўскага руху. Пачала ўлівацца ў каманду, а пасля заняла пост камісара і застаецца на пасадзе дагэтуль. І гэты пост — не проста фармальнасць, яна адказвае за ўнутраны расклад атрада, за падрыхтоўку да конкурсаў і арганізацыю актыўнага адпачынку.

У складзе «Эўрыкі» 15 студэнтаў з розных факультэтаў універсітэта. З цягам часу адбор у каманду станавіўся больш складаным і пільным, бо атрад, які сёмы год запар стаў найлепшым у краіне, імкнецца і далей несці дасягнутае за доўгія гады званне. На кастынгах у атрад будаўнічага кірунку адбіраюць не толькі па фізічных здольнасцях, але і па творчых і спартыўных. Акрамя работы на аб'ектах у летні перыяд байцы цэлы год змагаюцца ў розных конкурсах, набіраюць балы, якія становяцца вырашальнымі ў фінальным падвядзенні вынікаў, таму тут і «дастаюць з рукавоў козыры»: вакал, харэаграфію, валоданне музычнымі інструментамі, фізічную падрыхтоўку. Зімовай парой члены «Эўрыкі» працоўным дэсантам высаджваюцца на Гомельшчыне, дапамагаюць пажылым людзям, займаюцца з дзецьмі.

Асаблівым гонарам лічаць удзел у будаўніцтве аб'ектаў касмадрома Усходні, што знаходзіцца ў горадзе Цыялкоўскі Амурскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Свой першы вопыт на будоўлі за межамі краіны моладзь атрымала ўжо ў мінулым годзе, эмоцыі былі вельмі яркімі. У жніўні 2022 года полацкія студатрадаўцы былі задзейнічаны на будаўніцтве кватэр для работнікаў касмадрома, метэастанцыі. А сёлета вярнуліся на аб'ект зноў, прымалі ўдзел у добраўпарадкаванні стартавага корпуса «Ангара», з якога ў будучым тут плануюць запускаць ракеты.

«Калі мы вярнуліся сюды на другі год, эмоцыі ад аб'ёмаў праробленага зашкальвалі. Прыемна бачыць, як вырас горад і аб'екты касмадрома, усведамляць, што да гэтага мы, беларускія студэнты, таксама прыклалі руку. Гэта вялікі гонар і вельмі карысны вопыт. Нягледзячы на тое, што былі пэўныя праблемы са зменай клімату, гадзіннага поясу, гэты месяц пакінуў у мяне і таварышаў толькі цёплыя ўспаміны», — дзеліцца ўражаннямі Дар'я.

Ёсць у летапісе атрада яшчэ адна, больш важная, старонка: работа на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі — Беларускай атамнай станцыі. У Астраўцы члены студатрада працуюць з 2014 года, «ветэраны» студатрадаўскага руху памятаюць, як укладвалі плітку. Цяперашняе пакаленне байцоў з Полацка прымала ўдзел у будаўніцтве жыллёвага фонду, маладзёжнага цэнтра, добраўпарадкаванні тэрыторыі АЭС. «Я працавала на аб'екце з 2021 года, у верасні бягучага года мы завяршылі работу, і шмат чаго змянілася, у прыватнасці горад і сама станцыя. Калі параўноўваць адчуванні ад АЭС і касмадрома, то першае ўсё ж такі адгукаецца ў сэрцы мацней. Гэта сваё, роднае, таму перапаўняе гонар за дасягненні беларусаў, што дае нагоду яшчэ больш любіць сваю краіну і яе людзей», — расказвае камісар атрада.

Сёмы год запар «Эўрыка» становіцца найлепшым студатрадам, а ў агульнай колькасці цэлых дзевяць разоў байцы Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта былі ўшанаваны гэтым званнем, атрымліваючы пераходны сцяг. Адзін такі сімвал ужо застаўся ва ўніверсітэце назаўсёды, цяперашнія студатрадаўцы імкнуцца пакінуць у альма-матар і другі сцяг як сімвал адзінства і моцнага каманднага духу, без якіх атрад не змог бы дасягнуць такіх вяршынь.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з архіва атрада.

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

Дзмітрый ШАБЕЦЯ:

«НЕ КОЖНЫ ЧАЛАВЕК МОЖА ПРЫМЕРАЦЬ СТОЛЬКІ РОЗНЫХ ВОБРАЗАЎ»

СКРЭТ таго, як малады артыст оперы можа быць даволі вядомым шырокай публіцы, ведае Дзмітрый Шабец. У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі ён служыць некалькі гадоў, але гледачы адразу звярнулі ўвагу на яго голас і на тое, што Дзмітрый нібыта растварэцца ў вобразах, якія ўвасабляе. Такое адчуванне, што ён не толькі працуе ў гэты момант, але і атрымлівае рэальнае задавальненне ад таго, што робіць. Прычым не толькі ў тэатры. Ён артыст яшчэ актыўна канцэртуе па Беларусі. У рамках уласнага праекта «Беларускія прэм'еры» ён прадстаўляе музыку айчынных кампазітараў, праводзячы, па сутнасці, асветніцкую работу. Бо любоў да такога няпростага мастацтва, як опера, пачынаецца з прыгожай мелодыі, а таксама імя кампазітара і выканаўцы, якога потым захочацца паслухаць яшчэ...

— Прыход у Вялікі тэатр стаў новым этапам, які на вас, падобна, падзейнічаў натхнёна...

— Першапачаткова пасля заканчэння Акадэміі музыкі я пайшоў працаваць у Музычны тэатр. На той момант, калі скончыў вучобу, былі пытанні з размеркаваннем стажоравў, немагчыма было пайсці адразу ў салісты оперы. Памятаю, калі ў нас было размеркаванне, Кацярына Мікалаеўна Дулава, якая была тады рэктарам Беларускай акадэміі музыкі, убачыла, што я іду ў Музычны тэатр, паглядзела на мяне са здзіўленнем. Цяпер ужо шмат што змянілася, ёсць магчымасць, каб маладыя людзі прыходзілі пасля вучобы па размеркаванні ў Вялікі тэатр. Але я пачаў працаваць у Музычным тэатры, і лічу, што гэта выдатная школа для артыста. Асабліва, калі трапляеш у такія творчыя абставіны, заняты цікавай працай. Акрамя аперэт, там ідуць мюзіклы і шмат канцэртаў. Цікава і тое, што ў іх даволі часта бываюць гастролі па Расіі. У мяне за адзін год было, напэўна, больш за сто канцэртаў у Музычным тэатры. Гэта дапамагло адчуць унутраную свабоду, справіцца са сцэнічным хваляваннем, уласцівым маладому артысту, які толькі выпусціўся з кансерваторыі. Плюс яшчэ і ў тым, што ты глядзіш, назіраеш і бярэш усё найлепшае ад найлепшых. Гэта добрая школа.

У Вялікі тэатр я б адразу з задавальненнем прыйшоў працаваць, каб была такая магчымасць. Але, лічу, што нічога не страціў: там шмат пачарпнуў для сябе. І тут працягваю развівацца: партый вельмі шмат, рэпертуар пашыраецца. Вось таму да ўсяго ёсць вялікая цікавасць.

— У Музычным тэатры свая спецыфіка. Напэўна, трэба было перастройвацца?

— Я заўсёды спяваў адным і тым жа голасам. Насамрэч першапачаткова я эстрадны выканаўца, з самага дзяцінства спяваў эстрадную музыку, «папсу» ў шырокім паняцці гэтага слова. Але пайшоў вучыцца на акадэмічны вакал, таму што мне было важна атрымаць менавіта гэтую адукацыю. Хацелася навучыцца спяваць па акадэмічных канонах, таму што калі ты ведаеш асновы дыхання, пеўчай правільнай тэхнікі і гэтак далей, то твой голас гатовы да цяжкасцяў. Ты можаш спяваць усё ў любым жанры, у якім табе зручна, у якім трэба будзе працаваць як выканаўцы. Музычны тэатр адрозніваецца тым, што ў ім ёсць менавіта мюзіклы, а гэта ўжо зусім іншая падача, іншы гук. У адрозненне ад той жа класічнай аперэты, у якой іншая асабліваць — вельмі шмат гутарковага тэксту. У нас у оперным тэатры, напрыклад, ідзе «Лятучая мыш» — вялікую сцэну агучыць без мікрафона менавіта з натрэбнай падачай голасу даволі праблематычна, як бы правільна ты ні гаварыў. У Музычным тэатры ў гэтым плане значна прасцей, таму што там ёсць мікрафон, ты можаш рухацца як заўгодна, але публіка цябе пры гэтым чуе. Музычны тэатр мне блізкі, у мяне там шмат сяброў. Але справа ў тым, што опера мне заўсёды была больш цікавай, я да яе імкнуўся.

— Таму так актыўна кінуліся ў працу?

— Я бяру толькі тыя партыі, якія, на мой погляд, будуць карысныя для майго развіцця як выканаўцы. Усё і адразу спяваць немагчыма ў любым выпадку. Ёсць разуменне таго, што гэта рэпертуарны тэатр. Таму ў рэпертуарнага тэатра ў любым выпадку будуць нейкія патрабаванні, бо ёсць творчая неабходнасць у канкрэтным персанажы, значыць, гэтую праблему трэба вырашаць. І я стараюся не «скакаць праз галаву». Шмат разоў мне прапаноўвалі спяваць Германа ў «Пікавай даме». Адмаўляўся, пакуль гэта не хачу спяваць: руская музыка — гэта наогул вельмі цяжка. У мяне, дарэчы, у асноўным замежная класіка і беларуская. Рускай мала, таму што я баюся гэтай музыкі. Насамрэч нялёгка ўвасобіць таго ж Германа, таму што ты пачынаеш жыць з гэтай партыяй, крыху трансфармуешся па стане ў гэтага персанажа. Думаю, такія партыі павінны прыходзіць з досведам. Іх трэба напоўніць унутрана, каб потым выстаўляць напаказ.

Пра нейкія партыі я марыў заўсёды — Каварадосі («Тоска»), Радамес («Аіда»), Самсон («Самсон і Даліла»). Люблю гэтыя оперы, але разумею, што выконваць іх па ўзросце ранавата таксама. Але я спяваю і Паўля ў «Мёртвым горадзе» Карнгольда ў маскоўскай «Новай оперы». І «Аіду» ў Масква спяваю. Разумею, што мне гэтая музыка цяпер патрэбна.

— Што дае ўдзел у маскоўскіх спектаклях? Гэта зусім іншы тэатр, іншы падыход да оперы.

— Што менавіта да «Новай оперы» — у іх цікавыя пастаноўкі. Там даволі кампактная зала, фармату нашага музычнага тэатра. Яны «заточаныя» на тое, каб нечым здзіўляць: праз відэарад, кампазіцыйныя рашэнні, тое, што датычыцца рэжысуры. Напрыклад, у пастаноўцы «Мёртвага горада» — гэта ліфт, які ездзіць на два паверхі і цалкам выцясняе аркестравую яму. Аркестр ззаду цябе, дырыжора бачыш толькі на маніторах, якія расстаўлены ў зале. Акустыка мяняецца ў кожным пункце, у гэтым, вядома, вялікая складанасць: ты ўвесь час перастройваешся пад тыя адчуванні, у якіх трэба працаваць у кожнай канкрэтнай частцы сцэны. Але яны здзіўляюць, там шмат добрых пастановак. І класныя салісты. Калі хто хоча паслухаць оперу ў іншай візуалізацыі, то чаму б не? Бо ў нас у тэатры больш класічны падыход да оперы. Дарэчы, «Аіда» там і ў нас — вельмі розныя спектаклі. У нас гэта прыгожая, проста фантастычная пастаноўка. Мала які тэатр можа дазволіць сабе такі маштаб, вялікае задавальненне спяваць у такім спектаклі...

Але супрацоўніцтва з іншымі тэатрамі развівае выканаўцу ў любым выпадку. Калі працуеш у розных пастаноўках адной і той жа оперы, персанаж напаўняецца новымі фарбамі. Бо калі ты выходзіш у адным спектаклі, то наперад ведаеш, што табе трэба рабіць, якія мізансцэны і гэтак далей. Але калі з'яўляюцца іншыя пастаноўкі, у якіх пастаўлены і новыя задачы для цябе як для артыста, нават могуць мяняцца абставіны, у якіх існуюць героі, то гэта стымулюе на далейшае развіццё. Безумоўна, ёсць пастаноўкі, якія нічым цябе не здзівяць, яны могуць нават раздражняць і не падабацца, але з гэтым таксама даводзіцца спраўляцца. Дарэчы, такі перыяд перажываюць усе вакалісты, якія, напрыклад, вучацца ў кансерваторыі: калі табе даюць твор, які табе не падабаецца, ты не хочаш яго спяваць, але табе кажуць, што ты павінен зрабіць яго такім, каб палюбіць. Таму што ў тэатры табе даведзецца працаваць у пэўных абставінах. Нават калі ёсць выбар, што спяваць, а што — не. Бо бываюць спектаклі, у якіх сябе трэба пераломваць, каб партыя стала зручнай, а спектакль — утульным. Канешне, тэатр нешта прапануе ў плане рэпертуару, але ад чагосьці артысту ўсё ж трэба адмаўляцца, а ад чагосьці — не...

— Як ад партыі Рамана ў нацыянальнай оперы «Сівая легенда»?..

— Я чатыры гады яе дамагаўся. Вельмі хацеў гэта праспяваць. Спектакль глядзіцца на адным дыханні, вельмі кампактная опера. Дарэчы, калі я паслухаў арыгінальную арыю Рамана (з першай рэдакцыі), я зразумеў, што цяпер яна стала больш прыгожай, гучыць проста фантастычна. Раней марыў, але не спеў: так атрымлівалася, што ці то спектакль гэты ішоў не надта часта, ці то я з'яжджаў... І вось зараз супала, што і я прасіў гэта праспяваць, і мне сказалі «так». Вельмі прыгожая музыка, моцны персанаж, моцны спектакль. Нейкія тэхнічныя і пастановачныя недапрацоўкі (на мой погляд) музыка кампенсуе з лішкам. Радуюся, што партыя Рамана ў маёй творчай скарбонцы. Маё жаданне было прадыктаванае найперш прыгажосцю музыкі, потым ужо я думаў пра тое, што гэта нацыянальны рэпертуар. Але я люблю спяваць па-беларуску.

— Кажуць, што гэта не так проста для вакаліста...

— Вельмі не проста. Але гэта праца на супраціўленне. Таму што мова мілагучная, але месцамі яна дае жорсткасць, а праз слова можна данесці вельмі шмат. Плюс персанаж дваякі: то ён лірычны, то ён вельмі драматычны. У гэтым таксама была цікавасць.

Калі я яшчэ вучыўся ў кансерваторыі, то спяваў арыю Кізгайлы, яна мне таксама вельмі падабалася. З яе і пачалася любоў да музыкі Дзмітрыя Смольскага. Калі оперу выпусцілі, яна ўсюды гучала. Гэта музыка, якую адзін раз пачуў, а потым ходзіш і напяваеш. Арыя Рамана мне падабалася нават менш, насамрэч. Але потым, калі ўбачыў гэтую оперу, патраліў на вельмі добры склад выканаўцаў, то зразумеў, што я таксама жадаю гэта спяваць, таму што вельмі моцная музыка, якая ўзнімае дух і дае вялікі зарад. Пасля дзбюту ў партыі Рамана я не мог спаць, хацелася яшчэ адзін такі спектакль праспяваць... А ёсць спектаклі, пасля якіх хочацца выключыцца і адпачыць.

— Вы спявалі і барытонавыя партыі, і тэнаравыя. У выніку вызначыліся як тэнар?

— Мой дыяпазон і афарбоўка голасу дазваляе спяваць і тое, і тое. У часы вучобы я кансерваторыі ў мяне былі яшчэ пошукі ў гэтым плане. Было пытанне: ці хачу я цягнуцца ўверх і спяваць у тэсітуры, якая зручная? Натуральна, захацелася, таму стаў спяваць вышэй. Тэнар, як правіла, станоўчы персанаж. Акрамя таго, тэнаравы рэпертуар больш разнастайны, чым у барытонаў. І, на мой погляд, больш цікавы. Хоць ёсць барытонавыя партыі, якія хочацца праспяваць, і калі-небудзь, магчыма, мяне ўбачаць у вобразе Гразнога або Скарпіа. Прычым пераход ужо будзе апраўданы ўзростам.

— Але тэнары, як правіла, больш запатрабаваныя...

— Дарэчы, у штаце Вялікага шмат тэнараў. Але справа ў тым, што на маім рэпертуары практычна нікога няма, а было б нядрэнна: ці замена, ці нават проста дубль, які можа спатрэбіцца любому вакалісту — мы ж людзі, можам і захварэць, і лепш паберагчы сябе ў такім стане. У любым выпадку тэатральным раскладам, які складаецца на месяц наперад, агаворваецца, каб максімальна пазбегнуць залішняй нагрузкі і нязручнасцяў для артыстаў.

А яны бываюць — гэта жыццё. Напрыклад, я лётаў у Баку спяваць «Кармэн». У нас толькі адзін рэйс, які ляціць у пэўны час. Пераплёт сам па сабе — выпрабаванне. А я прыляцеў, паспаў дзве гадзіны і пайшоў на спеўку, а потым на дзень. Але без выхаду на сцэну артыст шмат страчвае. На сцэне трэба быць пастаянна, трэба на ёй жыць, наша прафесія прадугледжвае гэта 24/7.

Прафесія выдатная, я яе вельмі люблю. Рады, што займаюся сваёй улюбёнай справай, і кожны персанаж, які ў мяне ў скарбонцы, дадае эмоцыі, цеплыню на душы, асабліва калі рыхтуеш новую ролю і пачынаеш з ёй зрастацца. Не кожны чалавек можа прымерацьі столькі розных вобразаў, а наша прафесія дазваляе гэта зрабіць, што немагчыма сумаваць ні душой, ні целам, ні мазгамі. Напрыклад, адзін клавір — гэта прыкладна 300-400 старонак (кніжачка з нотамі,

аркестравую рэпетыцыю. Адкуль у мяне ўзяліся сілы і голас?.. На наступны дзень быў яшчэ адзін праграм і спектакль. Вакалісты вельмі часта пастаўлены ў нязручныя ўмовы, але гэта прафесія для моцных людзей. Тут трэба мець жалезныя нервы, і характар патрэбен пэўны, каб вытрымаць магчымыя прэсінгі.

— Вас у Вялікім тэатры, хутчэй за ўсё, будуць яшчэ больш нагружаць...

— Я гэтага не баюся. Але няхай гэта ідзе на карысць. Таму што праца — гэта ў любым выпадку добра. Шмат працы нікому не шкодзіць: ты ўвесь час у тонусе, голас у трэнажы. Бо ёсць небяспека ў тым, калі выходзіць на сцэну рэдка: трэнінг знікае, могуць забывацца нейкія моманты, і голас трэба падтрымліваць у форме. Вядома, нікто не перашкаджае займацца вакалам кожны дзе шмат тэксту, калі ён на замежнай мове, то кожнае слова перакладаеш). Мы трэніруем свой мозг увесь час, таму што вучым, паўтараем, плюс аналізуем, калі ідзе разбор клавіра. Займальная дзейнасць, праўда?

— Такое адчуванне, што вы жывяце толькі музыкай і операй...

— Дзякуй богу, тут усё ў парадку. Я паспяваю займацца не толькі любімай прафесіяй, але і сустракацца з сябрамі, наведваць выставы, люблю хадзіць у нешыя тэатры. Таксама люблю адрывацца і пагуляць. Абавязкова трэба сабе даваць адпачынак. Таму што, калі ты маральна не разнявольваешся, то паступова нарастае назапашвальны эфект ад стомленасці.

— Хто вам дапамагае ў гэтым?

— Сябры, безумоўна, сям'я, мая каханая жонка. Імкнуся праводзіць больш часу з дарагімі людзьмі. Дарэчы, бывае трэба пабыць і сам-насам са сваімі думкамі, нават нікуды не выходзіць — сёння ты адпачываеш так, а заўтра можаш пайсці ў клуб да раніцы. У залежнасці ад настрою. Трэба ўмець пераключацца на розныя станы.

— У чым бачыце для сябе развіццё ў Вялікім тэатры Беларусі? Што для вас у прыярытэце як для артыста?

— Як артыст я магу развівацца толькі дзякуючы сваім калегам, якія разам са мной працуюць у спектаклях. Бо калі ёсць тандэм, калі ёсць добры кастынг на спектакль, гэта вельмі шмат значыць. Калі чалавек не замінае табе працаваць, а, наадварот, дапамагае для таго, каб цябе ўзняць на свой узровень ці на больш высокі ўзровень, гэта вельмі важна. Можна развіваць сябе пашырэннем выкананых персанажаў, браць для сябе новыя вяршыні. Бо без новых партый, без новага рэпертуару, без унутранага напаўнення для кожнага персанажа нічога не будзе. Дзеля гэтага чытаю і перачытваю кнігі. Перыядычна перагледжваю нейкія фільмы. І гляджу новыя пастаноўкі тых спектакляў, у якіх ужо спяваю — можна нейкія сцэнічныя рэчы для сябе знайсці. Іншымі словамі, трэба абавязкова шмат слухаць, шмат чытаць, глядзець і сачыць за працай іншых, хадзіць на спектаклі сваіх калег і ў іншыя тэатры. Дзякуй богу, мы з жонкай гэта ўсё вельмі любім і як гледачы.

— Добра, калі займаешся любімай справай. А ці важна вам адчуваць аддачу? Напрыклад, у выглядзе медаля Францыска Скарыны, які вы атрымалі сёлета?

— Мне здаецца, што ўсё добра ў свой час. Бывае, што нейкія ўзнагароды, медалі і званні людзі атрымліваюць ужо ў самавітым узросце, амаль у канцы кар'еры, якую чалавек мог бы рабіць больш натхнёна, атрымаўшы стымул у развіцці. У любым выпадку, чалавек працуе, бо не можа інакш. Але добра, калі яго заўважае не толькі публіка.

Мае значэнне і колькасць спектакляў у рэпертуары. Бывае, што артыст за год зрабіў такія партыі, што людзі рыхтуюць за жыццё. Чаму гэта нельга адзначыць раней, чым падыдзе ўзрост для нейкіх узнагарод? Мы ж працуем не ў пустэчу. Працуем на прафесійным узроўні і адчуваем водгук ад гледачоў.

Што датычыцца ўзросту, то ёсць яшчэ адзін момант, на які хацелася б звярнуць увагу. Усе разумеюць, якую нагрузку нясуць артысты балета, яны не могуць бясконца доўга танцаваць на адным узроўні чыста фізічна, як бы гэтага ні жадалі. Такая ж гісторыя ў вакалістаў са звязкамі. Усё зношваецца. Арганізм старэе, і голас відавочна не стане маладзейшым з часам, — гэта ж таксама мышцы, якія цягнуць цябе ўсё жыццё. Мне здаецца, што стаўленне да артыстаў оперы ў плане пенсіі павінна быць такім жа гнуткім, як і ў балеце. Бо ёсць пэўны запас твайго рэсурсу. Вядома, артысты самі могуць вырашаць, калі ім сыходзіць — калі ёсць сілы працаваць, то дай бог. Але калі б была такая магчымасць, мне здаецца, многія б задумаліся. Хоць гэта і вельмі вялікая радасць — сцэна не адпускае ні ў якім узросце. Мой педагог Эдуард Іванавіч Пелагейчанка сышоў з тэатра, але калі яго абудзіць уначы і папрасіць праспяваць нейкую партыю, ён запраста гэта зробіць, бо столькі ўсяго было выканана, яно застаецца на ўсё жыццё.

Бо, калі ты зараджаеш увесь спектакль сваёй энергетыкай, сваім персанажам, то стараешся, каб людзі паверылі і адчулі тое, што ты зараз перажываеш. І гэта, дарэчы, не залежыць ад таго, што я люблю спяваць. Напрыклад, тую ж «Тоску» — надзвычай прыгожая музыка. Каварадосі як персанажу немагчыма не спачуваць: насамрэч усе праблемы ад кахання. Гэта вельмі кранальна, і таму глядач ужо да фіналу спектакля адорвае цябе сваімі апладысментамі. Ідзе энергетычны абмен паміж намі, таму што ты разумееш, што не дарма стараўся, што не дарма працаваў. За час спектакля ты аддаў усе сілы, поўнасцю разрадзіўся, але ў гэты ж момант цябе зарадзілі зноў. Гэта вельмі крутое пачуццё.

— А ці быў нейкі такі момант, калі вы для сябе засеклі: вось яно...

— Насамрэч, гэта было яшчэ на першых гастролях з Музычным тэатрам, здаецца, у Смаленску. Я прыехаў як новы артыст, праспяваў пару твораў і — ваў! Авацыі. Натуральна, мы такое перажывалі і на сцэне кансерваторыі. Але канцэртаў, каб так апладзіравалі, у мяне яшчэ не было. Момант, калі я зразумеў, што вучыўся не дарма, як хацелі мае бабулі і марылі на мяне паглядзець. Думаю, яны маглі б мной ганарыцца...

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота дадзены тэатрам.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

З чаго пачынаецца любоў да оперы

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703

Продавец: ОАО завод «ВИЗАС», 210602, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

№ лота	Инв. номер	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 95 %)				
1	3698	Модернизация вальцев резинообр. ЛБ-200 100/100	3678,00	183,90
2	3009	Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие	3354,00	167,70
3	3010	Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие	3354,00	167,70
4	3011	Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие	3462,00	173,10
5	3012	Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие	3462,00	173,10
6	3013	Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие	3462,00	173,10
7	3014	Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие	3462,00	173,10
8	3015	Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие	3462,00	173,10
9	3807	Полуавтомат для заточки зуборезных головок ВЗ-685Ф2	45 600,00	2280,00

Перечень 3 (снижение начальной стоимости 95 %)

Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

10	687	Эстакада для выпрямителей ВАКГ-3200	3,00	0,15
11	1697	Печь ОКБ 8084	2100,00	105,00
12	3630	Водонагреватель «Нева-3208-02»	5,40	0,27
13	3631	Водонагреватель «Нева-3208-02»	5,40	0,27
14	3680	Модернизация устройства МТП-318 (Н481)	762,00	38,10
15	3032	Стенд д/исп. фрез ЗМА-376	420,00	21,00
16	371	Стол СТ-9 к микроскопу СТ-9	384,00	19,20
17	3760	Измерительная машина специальная СТ-4.10	1314,00	65,70
18	425	Уровень электронный А12	132,00	6,60
19	7249	Прибор для проверки червячных фрез КЭФ-270	1458,00	72,90
20	3121	Центрифуга d=200-450мм	22,20	1,11
21	3681	Наладка РШ-01 к станку ВЗ-580Ф4	5994,00	299,70

Перечень 4 (снижение начальной стоимости на 95 %). Готовая продукция, расположенная по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

22	1-03	Станок для закругления режущих кромок зубов твердосплавных пил ВЗ-478	150,00	7,50
23	3	Контрольно-измерительное устройство ВЗ-681	528,00	26,40
24	2	Контрольно-измерительное устройство ВЗ-681	528,00	26,40
25	1	Контрольно-измерительное устройство ВЗ-681	528,00	26,40
26		Контрольно-измерительное устройство ВЗ-682 1Ф (в количестве 10 ед.). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	360,00	18,00
27	4	Приспособление для заточки пил вертикальных лесопильных рам ВЗ-879-02 ПЗ (L=1250-1950 мм)	180,00	9,00
28	3	Приспособление для заточки пил вертикальных лесопильных рам ВЗ-879-02 ПЗ (L=1250-1950 мм)	180,00	9,00
29	5	Приспособление для заточки пил вертикальных лесопильных рам ВЗ-879-02 ПЗ (L=1250-1950 мм)	180,00	9,00
30	1	Устройство измерительное для контроля зуборезных головок ВЗ-671	1188,00	59,40

Перечень 5 – Незавершенные производством станки, узлы станков, детали и элементы, расположенные по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83 (снижение начальной стоимости на 95 %)

№ лот	Наименование	Готовность, %	Кол-во	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
31	Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (2 кожуха, станина и КД)	90	1	1172,10	58,61
32	Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД)	70	1	911,64	45,58
33	Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД)	70	1	911,64	45,58
34	Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД)	70	1	911,64	45,58
35	Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (комплект деталей)	50	6	3907,08	195,35
36	Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей)	50	1	396,72	19,84
37	Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей)	50	1	396,72	19,84
38	Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей)	50	1	396,72	19,84
39	Станок для заточки плоских ножей (с поворотным столом) ВЗ-874 (комплект деталей)	40	5	710,10	35,51

Перечень 8 – Лот 40: имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, д. 83

Наименование (назначение), инвентарный номер	Общ. пл., кв. м
Административно-бытовой корпус № 1 (здание административно-хозяйственное), инв. номер 200/С-61161	7582,7
Административно-бытовой корпус № 3 (здание административно-хозяйственное), инв. номер 200/С-61160	3568,7
Производственное помещение (производственное помещение), инв. номер 200/D-175256	44 519,1
Автостоянка (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. номер 200/С-501697	1387,1
Внеплощадочные кабельные сети (сооружение специализированное энергетики), инв. номер 200/С-500509	1260
Тепловые сети (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 200/С-500510	70,5
Благоустройство территории (сооружение благоустройства), инв. номер 200/С-502429	25 477,3

Кабельные сети (сооружение специализированное энергетики): инв. номер 200/С-501645 (общ. пл. 176,9 кв. м), инв. номер 200/С-501646 (общ. пл. 135,7 кв. м), инв. номер 200/С-501647 (общ. пл. 242 кв. м), инв. номер 200/С-501648 (общ. пл. 23,7 кв. м), инв. номер 200/С-501649 (общ. пл. 151,9 кв. м), инв. номер 200/С-501650 (общ. пл. 153,9 кв. м), инв. номер 200/С-501652 (общ. пл. 75,9 кв. м), инв. номер 200/С-501653 (общ. пл. 131,7 кв. м), инв. номер 200/С-501655 (общ. пл. 177,7 кв. м), инв. номер 200/С-501662 (общ. пл. 84,4 кв. м)

В состав лота входит иное имущество (в кол-ве 91 ед). Подробный список размещен на сайте организатора аукциона **www.ipmtorgi.by**

Начальная цена с НДС 20 %	**5 534 589,60 бел. руб. (снижение стоимости на 40 %)**
Шаг аукциона	**276 729,48 бел. руб.**
Обременения	**Аренда.** Подробная информация у Продавца

Сведения о земельном участке с кадастровым номером 240100000001005466: предоставлен на праве аренды по 03.04.2068 (доля 999/1000), общей площадью 10,4867 га для содержания и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений

Перечень 9 (снижение начальной стоимости на 80 %). Готовая продукция, расположенная по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

№ лота	Инв. номер	Наименование	Ед. измерения	Кол-во	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. (за 1 единицу)	Шаг аукциона, бел. руб.
41		Оправка балансировочная 3Е642Е.96.201 – 5 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	5	46,84	2,34
42		Оправка (d22мм ВЗ-384.П22.052 – 3 единицы). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	3	26,40	1,32
43		Оправка (d27мм ВЗ-384.П22.053 – 4 единиц). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	4	26,40	1,32
44	1	Ограждение ВЗ-318Е.94.000	шт.	1	27,36	1,37
45		Бабка задняя ВЗ-384.П22.046 – 3 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	3	60,00	3,00
46		Бабка передняя ВЗ-384.П22.011 – 3 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	3	60,00	3,00
47	300/07-01-08.К1	Изготовление заготовки для детали рэм-болт М20	150 шт.		32,40	1,62
48		Кожух ВЗ-319.92010 – 7 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	7	33,72	1,69
49		Кожух ВЗ-318М.92020 - 8 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	8	46,50	2,32
50		Кожух 3М642Е.92060 – 7 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	7	72,18	3,61
51		Кронштейн 3М642Е.92014 – 7 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	7	19,20	0,96
52	8-03, 3-03	П/автомат для обработки очковых линз по контуру ВЗО-229В	шт.	2	192,00	9,60
53		П/а шлиф. д/обработки очковых линз по контуру ВЗО-229М – 4 единицы. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	4	216,00	10,80
54		П/авт. для изготовления копиров ВЗ-346 – 5 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	5	120,00	6,00
55		Поводок 3М642Е.96020 – 3 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	3	2,64	0,13
56		Приспособление для заточки пил верт. л/п рам ВЗ-367.П3 – 9 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	9	36,72	1,84
57		Приспособление для заточки плоских ножей ВЗ-384 П26 – 2 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	2	33,60	1,68
58		Приспособление для заточки пил ВЗ-367.П1 – 5 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	5	120,00	6,00
59		Приспособление для заточки сверл ВЗ-384 П15 – 4 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	4	96,00	4,80
60	83	Присп. д/линейной правки круга и установки центров ВЗ-318.П5	шт.	1	86,88	4,34
61	7	Приспособление для заточки пил верт. л/п рам ВЗ-367.П3	шт.	1	26,40	1,32
62	300/53-66-14.К1	Редуктор конический КЗР-1	11 шт.		652,34	32,62
63	3, 4, 5	Редуктор конический КЗР-9	шт.	3	74,40	3,72
64	4	Система подачи СОЖ ВЗ-874.61.000	шт.	1	96,00	4,80
65	10-96	Станок специальный заточный для твердосплавных пил ВЗ-353	шт.	1	144,00	7,20
66		Стенд измерительный для твердосплавных пил ВЗ-479 – 4 единицы. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	4	124,98	6,25
67		Съемник ВЗ-318М.90202 – 26 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	26	0,72	0,04
68		Фитинг ДУ100 15.7879-3143 – 5 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	5	55,18	2,76
69		Фитинг ДУ133 15.7879-3145 – 5 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	5	64,94	3,25
70		Фитинг ДУ50 15.7879-3146 – 4 единицы. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	4	36,46	1,82
71		Фитинг ДУ89 15.7879-3144 – 5 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	5	45,89	2,29
72		ФЛАНЕЦ ВЗ-384.91010 – 8 единиц. Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	шт.	8	28,66	1,43
73	4-04	Хомутик 3М642Е.96030	шт.	1	0,96	0,05
74	17249	Вал 05-24-07152 300/53-02-12 К2	2 шт.		15,12	0,76
75		Приспособление для заточки торцовых фрез (d=80-400 мм) 3Е642Е.П21	шт.	1	943,20	47,16

Перечень 10 (снижение начальной стоимости на 80 %) – оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

№ лота	Инв. номер	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
76	3713	Станок точильно-шлифовальный ВЗ-879-02	120,00	6,00
77	2-03	Станок шлифовально-полировальный для корпусов твердосплавных пил ВЗ-477	960,00	48,00
78		Зуборезный станок с ЧПУ для конических колес модели ВЗ 720 Ф4	120 000,00	6000,00

Перечень 7 (снижение начальной стоимости на 80 %). Имущество, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
79	**Сырье, материалы, комплектующие, детали незавершенного производства и другое (в количестве 1 864 ед.).** Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by	129 903,80	6 495,19

